

Сацыяльная служба сёння гатова дапамагчы пенсіянерам і інвалідам у складаныя для іх часы. І не толькі адзінокім — таму што не заўсёды дзеці жывуць побач, а даглядаць бацькоў трэба. СТАР. 2



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**30 КАНАЛАЎ**



Усюдыход Мінскай аўтамабільнай зборкі — сродак амаль для абсалютнага бездарожжа. Ён можа выкарыстоўвацца як пошукавы аўтамабіль для касманаўтыкі, для геолагаў, ваенных, выратавальнікаў. СТАР. 8


Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

31 мая 2013 г. ПЯТНІЦА № 98 (27463) Кошт 1500 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


## ВЕСЦІ АКТЫЎНУЮ БАРАЦЬБУ З ПРАЯВАМІ МІЖНАРОДНАЙ ЗЛАЧЫННАСЦІ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка пацвярджае імкненне Беларусі прадаўжаць актыўную барацьбу з гандлем людзьмі і іншымі праявамі міжнароднай злачыннасці. Аб гэтым ён заявіў 30 мая на сустрэчы з намеснікам Генеральнага сакратара ААН — выканаўчым дырэктарам Упраўлення ААН па наркотыках і злачыннасці Юрыем Фядотавым, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

«Не выхваляючыся, Беларусь старалася зрабіць многае па тых напрамках работы, якія знаходзяцца ў вашай кампетэнцыі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гадоў 12-13 таму Беларусь вельмі актыўна занялася пытаннем барацьбы з гандлем людзьмі ў розных яго праяўленнях. Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусь набыла пэўны вопыт і па асобных напрамках значна рушыла наперад. «Мы гэтым ганарымся, таму што лічым, што ў сучасным свеце такія праяўленні недапушчальныя», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Што датычыцца барацьбы са злачыннасцю, то Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Беларусі складана, паколькі яна з'яўляецца транзітнай дзяржавай, і праз тэрыторыю краіны праходзяць патокі нелегальнай міграцыі, робяцца спробы перамяшчэння наркотыкаў, радыеактыўных рэчываў. «І нам хочаш не хочаш даводзіцца весці вельмі жорсткую барацьбу з гэтымі праявамі», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да Юрыя Фядотава, адзначыў, што Беларусі ёсць што расказаць у плане праводзімай работы па напрамках, якія ўваходзяць у кампетэнцыю Упраўлення ААН па наркотыках і злачыннасці. Што датычыцца праведзенай у Мінску канферэнцыі для прадстаўнікоў праваахоўных органаў дзяржаў — удзельніц Групы сяброў, якія аб'ядналіся ў барацьбе з гандлем людзьмі, то кіраўнік беларускай дзяржавы выказаў упэўненасць, што яна пойдзе на карысць усёй сусветнай супольнасці.

Юрый Фядотаў падзякаваў Прэзідэнту Беларусі за пастаянную падтрымку намаганняў ААН у пытаннях барацьбы з гандлем людзьмі, а таксама за тое, што робіць Беларусь на працягу многіх гадоў у гэтым напрамку. Ён адзначыў, што Беларусь стаіць ля вытокаў стварэння ў ААН Групы сяброў, якія аб'ядналіся ў барацьбе з гандлем людзьмі, а таксама з'яўляецца ініцыятарам Глабальнага плана дзеянняў ААН па барацьбе з гандлем людзьмі, прынятага Генеральнай Асамблеяй ААН у 2010 годзе. Ён падкрэсліў, што гэтай праблематыцы ААН удзяляе вялікую ўвагу. У прыватнасці, два тыдні таму ў Нью-Ёрку праходзілі мерапрыемствы на высокім узроўні, дзе абмяркоўваліся напрамкі работы па павышэнні эфектыўнасці міжнароднага супрацоўніцтва ў барацьбе з гандлем людзьмі.

«Голас Беларусі гучыць вельмі важка, аўтарытэтна, актыўна, з вамі лічацца, і гэта садзейнічае ў цэлым умацаванню іміджу Беларусі на міжнароднай арэне ў рамках ААН», — сказаў намеснік Генеральнага сакратара ААН — выканаўчы дырэктар Упраўлення ААН па наркотыках і злачыннасці.

Юрый Фядотаў адзначыў, што Генеральны сакратар ААН Пан Гі Мун прасіў перадаць Аляксандру Лукашэнку сваю высокую ацэнку тым намаганням, якія прыкладае Беларусь у гэтым напрамку.

## УСЁ ЯШЧЭ ТОЛЬКІ ПАЧЫНАЕЦЦА...



Фота Надзеі БУЖАН.

**Амаль для 145 тысяч выпускнікоў 9-х і 11-х класаў беларускіх школ прагучаў учора апошні званок, які, між іншым, азначае зусім не кропку, а новы этап у іх жыцці. Наперадзе хлопцаў і дзяўчат чакаюць выпускныя і ўступныя экзамены.**

Адметнасць гэтага года заключаецца ў тым, што ў графіку абавязковых выпускных экзаменаў на выхадзе з сярэдняй школы з'явіўся новы прадмет — замежная мова. І менавіта выпускнікам узору 2013 давядзецца першымі прадэманстраваць перад экзаменатарамі сваё свабоднае валоданне замежнымі мовамі.

Акрамя замежнай мовы, адзінаццацікласнікам давядзецца здаваць таксама экзамен па беларускай ці рускай мове, матэматыку і яшчэ адну дысцыпліну — на выбар выпускніка. А выпускнікоў базавай школы чакаюць чатыры іспыты — па беларускай і рускай мове, матэматыцы і гісторыі Беларусі.

Па назіраннях арганізатараў цэнтралізаванага тэсціравання, звычайна ўдзел у ЦТ бяруць да 90 працэнтаў выпускнікоў адзінаццатых класаў бягучага года. Але перад сёлетнімі выпускнікамі стаіць больш складаная задача, паколькі мінімальны станоўчы бал на ЦТ было вырашана павысіць: па рускай і беларускай мове гэта 10 балаў, па прыродазнаўчых прадметах — 15 і па гуманітарных — 20 балаў. Але ці набяруць абітурыенты, скажам, 15 балаў па матэматыцы? У Міністэрстве адукацыі лічаць, што для сёлетніх выпускнікоў — гэта цалкам дасягальная задача...

Выпускныя вечары адшумяць у беларускіх школах 11 і 12 чэрвеня.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**



Фота БЕЛТА.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Валянцін ЧАКАНАЎ, міністр гандлю:**

***«Абароне правоў спажыўцоў у краіне трэба надаваць больш увагі. Неабходна актывізаваць працу з таварыствамі абароны правоў спажыўцоў, як мага шырэй інфармаваць насельніцтва аб абароне іх правоў. Людзі павінны ведаць, што іх правы як пакупнікоў, спажыўцоў паслуг абаронены. Паводле вынікаў праверак, праведзеных Мінгандлем у 2012 годзе і першым квартале сёлета, больш чым у палове аб'ектаў гандлю і сферы бытавых паслуг былі выяўлены тыя ці іншыя парушэнні правоў спажыўцоў. Што тычыцца выяўленых парушэнняў, то асноўную іх частку складае рэалізацыя пратэрмінаваных тавараў. Акрамя таго, ёсць скаргі на парушэнні ўмоў захоўвання тавараў, санітарных патрабаванняў».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 31.05.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8680,00 | ▼ |
| Еўра | 11250,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 275,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1065,55 | ▼ |

### НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 21 |
| Віцебск | + 23° |
| Гомель | + 27° |
| Гродна | + 24° |
| Магілёў | + 25° |
| Мінск | + 26° |

### НОВАЯ МАНЕТА З ІКОНАЙ

Нацыянальны банк Беларусі ўводзіць сёння ў абарачэнне залатую памятную манету «Ікона Прасвятой Багародзіцы «Смаленская» серыі «Праваслаўныя цудатворныя іконы» наміналам 50 рублёў, пробай сплаву 999, масай 5 грамаў. «Манета адчаканена ў Германіі на манетным двары ТАА «Б.Х. Маерс Кунстпрэгеанштальт», якасцю «пруф» і тыражом да 5000 штук», — паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

БУДЗЬ У КУРСЕ

### Памежныя пункты «Доцішкі» і «Пяцюлеўцы»: змены ў рэжыме працы

З 31 мая па ўзгадненні з літоўскім бокам змяняецца рэжым работы пунктаў спрошчанага пропуску «Доцішкі» (Воранаўскі раён) і «Пяцюлеўцы» (Шчучынскі раён), інфармуе жыхароў памежжа Лідскі пагранічны атрад. Пункт «Доцішкі» будзе працаваць штодзённа з 9 да 20 гадзін, пункт «Пяцюлеўцы» — у пятніцу, суботу і нядзелю з 11 да 16 гадзін.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## ПЕРСПЕКТЫВЫ ВЯЛІКАЙ ВЫНІКОВАСЦІ

**Сёння ў Мінску ў «Прэзідэнт-атэлі» пройдзе пасяджэнне Савета кіраўнікоў урадаў краін — членаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў. На парадку дня — больш за 30 пытанняў, якія першы намеснік старшыні выканкама СНД Уладзімір Гаркун напярэдадні на сустрэчы з журналістамі назваў «маючымі перспектыву вялікай выніковасці».**

У эканамічным блоку кіраўнікі ўрадаў абмяркуюць найбольш пытанняў, што яшчэ раз паказвае прыярытэт рэальнага вектара ва ўзаемадзеянні краін Садружнасці. Найбольш насычаны блок дакументаў па інавацыйным узаемадзеянні. Тут краіны маюць намер дамовіцца аб супрацоўніцтве ў справах інфармацыйна-камунікацыйных і нанатэхналогій, у галінах авіяцыі, космасу, энергетыкі і зберагальных тэхналогій, рацыянальнага выкарыстання прыродных багаццяў, медыцыне і кіраванні транспартнымі калідорамі. Відавочна, што пытанні для Садружнасці жыццёва важныя, прычым наша краіна, якая старшынствуе сёлета ў СНД, унесла найбольшы пакет такіх важных дакументаў для разгляду.

Асобным пунктам, як падкрэсліў Уладзімір Гаркун, вылучаюцца пытанні супрацоўніцтва ў атамнай энергетыцы. «Гэта маштабнае пытанне, і для яго рашэння мы павінны аб'яднаць намаганні ўсіх краін.

З гуманітарных пытанняў найгалоўнейшыя — пагадненні аб ахове прыроды, стратэгіі развіцця фізічнай культуры і спорту, аб узаемадзеянні ў галінах адукацыі і вышэйшай прафесійнай падрыхтоўкі, аб стварэнні банка даных патэнтаў і інавацый СНД. Усё гэта працуе на перспектыву», — адзначыў ён.

У сферы бяспекі запланавана прыняцце важнага рашэння аб фінансаванні работ па стварэнні адзінай сістэмы ўліку грамадзян трэціх дзяржаў і асоб без грамадзянства, якія ўязджаюць на тэрыторыі дзяржаў — удзельніц СНД.

Уладзімір Гаркун паведаміў, што да пасяджэння падрыхтавана інфармацыя Міждзяржаўнага статыстычнага камітэта СНД. Па паказчыках інфляцыі, тавараабароту, інвестыцый, занятасці і іншых краіны Садружнасці ў эканамічным плане выглядаюць «здаравей», чым многія суседкі з Еўрасаюза.

Падчас правядзення пасяджэння запланаваны шэраг двухбаковых сустрэч кіраўнікоў урадаў.

**Пятро РАМАНЧУК.**

Сяргей ПІСАРЫК:

## «Мы заўсёды ўлічваем інтарэсы краіны...»

**Грошы — агульны здабытак. Кожнаму дазволена браць столькі, колькі ён хоча. Пры ўмове, што ён гэта можа. Такую думку аднойчы выказаў Вільгельм Швэбель, нямецкі вучоны і публіцыст. Зараз такі час, што ўзяць грошы могуць практычна ўсе. Галоўнае, каб былі фінансавыя інстытуты, якія змогуць іх даць. Сёння «Звязда» пазнаёміць вас са старшынёй праўлення найбуйнейшага банка ў нашай дзяржаве — Беларусбанка — Сяргеем Пісарыкам. Ён расказаў нашаму карэспандэнту пра дзейнасць і планы ўстановы на будучыню.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**— Сяргей Паўлавіч, банк не першы год удзельнічае ў крэдытаванні праектаў па мадэрнізацыі розных галін гаспадаркі. Што зроблена, якія планы ў сувязі з пастаўленымі кіраўніком краіны задачамі?**

— З крэдытнай падтрымкай банка пабудаваны і ўведзены ў эксплуатацыю завод газетнай паперы ў Шклове, новыя лініі па вытворчасці цэменту сухім спосабам на «Краснасельскбудматэрыялах» і Беларускім цэментным заводзе, цэх па вытворчасці драўнянастружкавых і ламінаваных пліт магутнасцю 250 тыс. куб. м за год на «Івацэвічдрэве», завершана тэхнічнае пераўзбраенне на папяровай фабрыцы «Спартак»; рэалізаваны праект па арганізацыі ў Мінску ўнутрыгарадскіх перавозак пасажыраў чыгуначным транспартам на ўчастку Мінск-Пасажырскі — Ждановічы, а таксама па будаўніцтве грамадска-гандлёвага цэнтра «Сталіца», гасцініц «Еўропа» і «Вікторыя» ў Мінску, рэканструкцыя гасцініцы «Кастрычніцкая» пад пяцізоркавы «Прэзідэнт-атэль». СТАР. 7

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### СІРЫЯ АТРЫМАЛА КОМПЛЕКСЫ С-300

Прэзідэнт Сірыі Башар Асад у інтэрв'ю мясцоваму тэлеканалу пацвердзіў паступленне ў Сірыю расійскіх зенітна-ракетных комплексаў (ЗРК) С-300. Таксама Асад паведаміў аб намеры прыняць удзел у канферэнцыі «Жэнева-2», падчас якой будуць абмяркоўвацца далейшыя меры адносна ўрэгулявання сірыйскага канфлікту. Раней міністр абароны Ізраіля Мошэ Яалон заяўляў, што Сірыя яшчэ не атрымала С-300, дадаўшы, што Ізраіль «ведае, як дзейнічаць» у выпадку, калі такія пастаўкі адбудуцца. Ізраіль асабліва занепакоены разгортваннем расійскіх комплексаў, паколькі С-300, як адзначаюць ваенныя эксперты, у стане пераадолець сістэму самаабароны, устаноўленую на самалётах ізраільскіх ваенна-паветраных сіл.

### БАНКІ КІПРА СТРАЦІЛІ 6,3 МІЛЬЯРДА ЕЎРА




Кіпрскія банкі за адзін месяц панеслі значныя страты ўкладаў. У красавіку 2013 года іх аб'ём скараціўся на больш чым шэсць мільярдаў еўра. Гэта звязана з тым, што міжнародныя крэдыторы запатрабавалі ўвесці аднаразовы падатковы збор з дэпазітаў на суму больш за 100 тысяч еўра. Такое падзенне не назіралася са снежня 2005 года. У сакавіку ў кіпрскіх банках знаходзіліся ўклады на суму ў 63,7 мільярда еўра, і літаральна за адзін толькі месяц яны знізіліся на 9,9%. Цяпер іх сума складае 57,4 мільярда. Таксама, паводле звестак кіпрскага Цэнтральнага банка, уклады мясцовых жыхароў упалі з 41,3 мільярда еўра да 38,3 мільярда.

### БРЫТАНЕЦ ПАМЁР АД ПЕРАДАЗІРОЎКІ COCA-COLA

Любоў да газаваных напояў Coca-Cola прывяла да чарговай трагедыі. У брытанскім графстве Заходні Ёркшыр памёр 30-гадовы мужчына, які кожны дзень ужываў некалькі літраў гэтай газіроўкі. Медыкі высветлілі, што смерць наступіла ў выніку моцнага ацёку органаў дыхання, які ўзнік у выніку ўжывання занадта вялікай колькасці вадкасці. Родныя брытанца наракаюць на тое, што Інман добраахвотна займаўся «самаразбурэннем». Сітуацыю пагоршыў лад жыцця мужчыны. У 17 гадоў у яго была дыягнаставана адна з формаў аўтызму — сіндром Аспергера. З гэтай нагоды Інман павінен быў на працягу ўсяго свайго жыцця знаходзіцца пад наглядам урачоў. Аднак ён усяляк стараўся абмежаваць зносіны з медыкамі. Між тым, гэта ўжо не першы выпадак, калі смерць надыходзіць у выніку празмернага ўжывання Coca-Cola. Раней у Новай Зеландыі ад сардэчнага прыступу, выкліканага перадазіроўкай салодкага напою, памерла 30-гадовая жанчына. Кожны дзень яна выпівала не менш за дзесяць літраў гэтай газіроўкі.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ТЭЛЕФОНЫ І ПЛАНШЭТЫ, ЯКІЯ ВЫКАРЫСТОЎВАЮЦЦА ПЕРАД СНОМ, ВЫКЛІКАЮЦЬ СТРЭС



Калі чалавек карыстаецца тэлефонам або планшэтам перад адыходам да сну, ён заганяе арганізм у стан стрэсу. Як адзначае Live Science, навукоўцамі з Тэхаскага Панамерыканскага ўніверсітэта было праведзена адпаведнае даследаванне. Аказалася, падобная актыўнасць на працягу дзвюх гадзін да сну павышала ўзровень стрэсу.

А вось адпраўка пошты, прагляд ТБ, трэніроўкі, чытанне не стваралі гэтага эфекту. Верагодна, выкарыстанне тэхнічных навінак парушала нармальны ход сну (шкоднае святло ад экранаў, які падаўляе выпрацоўку мелатаніну). Было даказана, што СМС і «прагулкі» па сеціве павышаюць рызыку бяссонніцы. А гэта спрыяе акумуляванню стрэсу. Акрамя таго, падобны від дзейнасці патрабуе ад чалавека ўважлівасці — гэта значыць, аб расслабленні гаворка ісці не можа. Дарэчы, не выключана, што людзі, якія першапачаткова знаходзяцца ў стрэсе, схільныя часцей выкарыстоўваць тэхніку перад сном. Гэтыя высновы падмацавала апытанне 500 чалавек 18—73 гадоў.

■ Неабыякавыя нататкі

## ЛЁН НА ДЗВЕ ДЗЯРЖАВЫ

### Алігархі не выратуюць галіну — яна не выжыве без дзяржаўнай падтрымкі

**Зараз уся Еўропа шалёна гоніцца за ўсім экалагічным, натуральным, тым, што не змяшчае сінтэтыку. Кажуць, тамтэйшыя алігархі носяць пакамечаныя гарнітуры з шэрага лёну. Усе модныя дамы́ лічаць справай гонару мець калекцыю адзення з ільняной тканіны. У Францыі выпусцілі пакет, вельмі падобны на наш, пластыкавы, з той розніцай, што ён... разлагаецца за два тыдні, бо зроблены з ільнянога валакна. Амерыка пачала сеяць лён, Кітай заваліў рынкі сваёй ільняной прадукцыяй. А што мы? Спахапіліся.**

Успомнілі, што ў Расіі і ў Беларусі лён вырошчвалі стагоддзямі. Вякамі складваліся традыцыі яго апрацоўкі, паляпшалася тэхналогія. Недзе на генным узроўні ў народа жыве памяць пра палатняныя бялізну, сукенкі, кашулі. Да таго ж бавоўна значна падаражэла на сусветным рынку. Дык грэх было б саступаць пазіцыі выскачкам-канкурэнтам, якія досвед вырошчванню лёну бессаромна падгледзелі ў нас: расіян і беларусаў. Прыкладна так разважаюць чыноўнікі выканкама Саюзнай дзяржавы, калі гавораць аб неабходнасці прыняцця праграмы па падтрымцы льняной галіны Беларусі і Расіі.

Лён — гэта не толькі вопратка, пасцельная і сталовая бялізна, гэта натуральная валакністая сыравіна, якая выкарыстоўваецца ў медыцынскай, хімічнай прамысловасці і шэрагу іншых галін. Лён умее прызвычайвацца, таму расце і на поўдні Беларусі, і ў Омскай, Томскай, Новасібірскай абласцях. Аграрыі кажуць, што лён — цудоўны санітар, ён ачышчае глебу, пасля яго добра сябе пачуваюць любыя культуры. Аднак да канца 90-х гадоў вытворчасць ільновалакна ў параўнанні з 50-мі скарацілася ў 4,5 раза. Гэта лічба ў цэлым на дзве дзяржавы. У асобных расійскіх рэгіёнах называлі лічбы зусім іншыя. Там вытворчасць традыцыйнай культуры зменшылася ў дзясяткі разоў. Адышлі ў нябыт ільнозаводы і тэкстыльныя прадпрыемствы. Усе, з кім давялося размаўляць падчас паездкі па чатырох абласцях Расійскай Федэрацыі, былі аднадушныя: далейшае развіццё галіны немагчыма без дзяржаўнай падтрымкі.

Прыкладам таму, на маю думку, можа паслужыць адно з буйнейшых тэкстыльных прадпрыемстваў Кастрамской вобласці — Вялікая Кастрамская льняная мануфактура. Так яна называлася з царскіх часоў. Потым стала Ордэна Леніна камбінатам імя Леніна.

Тыповы льнозавод расійскай глыбінкі.



Цяпер камбінат пад назвай ААТ «БКЛМ—актыў» з'яўляецца прыватным прадпрыемствам. Гэта выпадак, калі прадпрыемства сапраўды слаўнае сваёй гісторыяй, якую беражліва захоўваюць у вялікай музейнай зале. Мануфактуру ў Кастраме ўзвялі браты Траццяковы ў 1886 годзе. Зямлю пад будоўлю купцам бязвыплатна выдзеліў імператар, ён жа вызваліў прамыслоўцаў ад падаткаў на 25 гадоў (вось вам узор дзяржаўнай падтрымкі. — **Аўт.**). Кастрамскія тэкстыльшчыкі тады былі ўдастоены гонару пастаўляць прадукцыю да імператарскага двара. Дарэчы, і зараз асобныя будынкі той мануфактуры служаць вытворчасці і паспяхова выкарыстоўваюцца. Не так даўно іх трываласць праверылі спецыялісты, сказалі: сто гадоў яшчэ прастаяць.

У савецкія часы тры работніцы камбіната былі ўзнагароджаны зоркамі Герояў Сацыялістычнай працы. Цэлы стос сцягоў за перамогу ў спаборніцтве сведчыць аб працавітых людзях прадпрыемства і іх дасягненнях. Адну са сцен упрыгожвае палатно, вытканае да 20-годдзя Перамогі — з гербамі ўсіх саюзных рэспублік. Тады не было тэхналогій лічбавага друку на тканіне, любы рысунак на палатне ствараўся рукамі. А на ганаровым месцы ў музеі вісіць тэкст завяшчання Пятра Траццякова. Вельмі цікавы дакумент! Па ім можна вучыцца ўсім працадаўцам — стаўленню да работніка. З тэксту відаць, якія ўзнагароджанні, акрамя зарплаты, уласнік мануфактуры вызначаў менавіта за добрасумленную працу. Тым больш што камбінат цяпер, як і ўсе прадпрыемствы Расіі, прыватныя. СТАР. 7

■ Парламенцкі дзённік

# ТРОШКІ ПАЛІТЫКІ, БОЛЬШ — ЭКАЛОГІІ

**Дэпутаты ратыфікавалі пагадненне, якое дазволіць упершыню ажыццявіць фінансаванне Еўрапейскім банкам рэканструкцыі і развіцця беларускага дзяржаўнага праекта**

Учора на пасяджэнні другой сесіі Палаты прадстаўнікоў дэпутаты разгледзелі ў першым чытанні 4 законапраекты і ратыфікавалі тры міжнародныя пагадненні. Два пагадненні датычыліся замежнага крэдыту для Беларусі на мадэрнізацыю ачышчальных збудаванняў у пяці гарадах.

## Першая ластаўка

— Размова ідзе пра невялікую суму каля 25 млн еўра па крэдытным дагаворы з Паўночным інвестыцыйным банкам і 18 млн еўра па крэдытным дагаворы з Еўрапейскім банкам рэканструкцыі і развіцця, — патлумачыў журналістам **Валерый БАРАДЗЕНЯ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах**. — Гэта, у першую чаргу, сацыяльна-экалагічны праект, у выніку якога будуць пабудаваны новыя біягазавыя комплексы на ачышчальных збудаваннях у Слоніме і Баранавічах і комплексна рэканструяваны ачышчальныя збудаванні ў Брэсце, Гродне і Віцебску. Стаўка, па якой даюцца крэдыты, невялікая, аднак адной з умоў з'яўляецца паступовае прывядзенне тарыфаў для насельніцтва за водаадвядзенне да ўзроўню сабекошту. Гэта не надта вялікая сума для людзей. На мой погляд, самае галоўнае ў гэтым праекце — экалагічны эфект. Мы атрымаем доступ да еўрапейскіх тэхналогій, зможам ацаніць, наколькі яны нам падыходзяць. Гэта — першы крок у супрацоўніцтве беларускай дзяржавы з Еўрапейскім банкам рэканструкцыі і развіцця, за якім, спадзяюся, будуць і далейшыя рухі насустрач адзін аднаму.

## За распаўсюджванне інфармацыі пра выбуховыя прыстасаванні — штраф

Адзін з прынятых у першым чытанні законапраектаў датычыўся дапаўнення Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях.

— Прапануецца ўвесці новы артыкул аб адказнасці за незаконнае распаўсюджванне матэрыялаў, якія прапагандуюць тэрарызм і экстрэмізм, — пракаментаваў праект **Эдуард СЯНЬКЕВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўстве**. — Размова пра інфармацыю ў інтэрнэце аб вырабе выбуховых прыстасаванняў. Для фізічных асоб прадугледжваецца штраф у памеры ад 10 да 50 базавых велічынь, для прадпрымальнікаў — ад 50 да 100 базавых велічынь. Пытанне наспела. Надышоў час абмяжоўваць распаўсюджванне такіх матэрыялаў.

## Грамадскія аб'яднанні змогуць стаць партыямі

Апошнім у парадку дня разглядаўся праект закона «Пра ўнясенні дапаўненняў і змен у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях дзейнасці палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў». Законапраект прадугледжвае магчымасць пераўтварэння грамадскага аб'яднання ў палітычную партыю. Дакумент таксама спрашчае патрабаванні да стварэння рэспубліканскіх грамадскіх аб'яднанняў. Прапануецца пакінуць агульную колькасць заснавальнікаў ранейшай, але выключыць патрабаванне па роўнай колькасці прадстаўнікоў ад рэгіёнаў краіны.

Апроч гэтага, прапануецца, што колькасць заснавальнікаў для пэўных відаў грамадскіх аб'яднанняў можа ўсталёўвацца адмысловымі законамі (напрыклад, законам аб творчых саюзах). Уносяцца карэкціроўкі, якія прыводзяць нормы законаў у адпаведнасць з Грамадзянскім кодэксам. Прапануецца спрасціць парадак ліквідацыі грамадскіх аб'яднанняў, палітычных партый, іх саюзаў і арганізацыйных структур. Калі палітычная партыя, грамадскае аб'яднанне ці іх саюзы шматкроць не падаюць штогадовую інфармацыю пра сваю працу ў адпаведныя органы, гэта можа стаць падставай для ліквідацыі. Уводзіцца і паняцце аддзялення міжнароднага грамадскага аб'яднання і яго статусу.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

■



# САЦЫЯЛЬНЫ РАБОТНІК — «ДОБРАЯ ФЕЯ» ДЛЯ НЯМОГЛЫХ ЛЮДЗЕЙ

**Сацыяльная служба сёння гатова дапамагчы пенсіянерам і інвалідам у складаныя для іх часы. І не толькі адзінокім — таму што не заўсёды дзеці жывуць побач, а даглядаць бацькоў трэба. У такім выпадку на дапамогу прыйдзе сацыяльны работнік. Колькасць людзей, якія жадаюць атрымаць яго паслугі, з кожным годам расце. Мы папрасілі дырэктара Мазырскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Лілію ЛОБАН падрабязней распавесці пра дзейнасць аддзялення сацыяльнай дапамогі на даму і пра платныя разавыя сацыяльныя паслугі.**

***— Якія разавыя сацыяльныя паслугі найбольш запатрабаваны?***

— Вядома, сацыяльна-бытавыя, паколькі спажыўцы гэтых паслуг — пажылыя людзі і інваліды, якія часта не могуць выйсці з кватэры, зрабіць прыборку, з-за сваіх захворванняў і абмежаванняў у перамяшчэнні. Да нас звяртаюцца іх дзеці, якія па той ці іншай прычыне не могуць даглядаць састарэлых бацькоў.

**Тэрытарыяльнымі цэнтрамі сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва прадастаўляецца каля 120 паслуг, якія з'яўляюцца агульнадаступнымі і бясплатнымі.**

Найбольш запатрабаванымі з'яўляюцца прыгатаванне ежы, мыццё і прасаванне бялізны, мыццё ваннаў, ракавін, унітазаў, халадзільнікаў і газавых пліт, апрацоўка прысядзібных участкаў. Запатрабаваныя таксама паслугі па касметычным рамонце жылых памяшканняў (пабелка столяў, сцен; афарбоўка вокнаў, дзвярэй, сцен, столяў; абклейванне сцен шпалерамі).

Карыстаюцца попытам і паслугі пагадзіннага дзённага догляду непрацаздольных людзей, якія страцілі здольнасць да самаабслугоўвання.

***— Колькі мазырчан скарысталіся такімі паслугамі?***

— Летась 52 сацыяльныя работнікі аддзялення сацыяльнай дапамогі на даму абслугоўвалі 461 чалавека. Жыхарам таксама была аказана 4181 платная разавая паслуга на суму 14,93 млн рублёў.

Два сацыяльныя работнікі аддзялення тэрміновага сацыяльнага абслугоўвання аказалі 447 разавых сацыяльна-бытавых паслуг для 136 непрацаздольных мазырчан на суму 6,35 млн рублёў. Акрамя таго, у аддзяленні тэрміновага сацыяльнага абслугоўвання адкрыты 2 стаўкі нянек у сувязі з нараджэннем трайнят.

***— Як адбываецца аплата?***

— Сацыяльныя паслугі на даму без спагнання платы аказваюцца малазабяспечаным адзінокім непрацаздольным грамадзянам. Гэта людзі, у якіх няма працаздольных членаў сям'і, абавязаных іх утрымліваць, і пры гэтым іх пенсія ніжэйшая за пражытковы мінімум (974 100 руб.).

На ўмовах частковай аплаты такія паслугі прадастаўляюцца адзінокім непрацаздольным грамадзянам, сярэднедушавы даход якіх не перавышае 200% бюджэту пражытковага мінімуму. Частковая аплата складае для непрацаздольнага чалавека 60% ад тарыфу, а для непрацаздольнай сям'і — 50%.

Усім астатнім непрацаздольным грамадзянам паслугі прадастаўляюцца за поўную плату. Тут маюцца на ўвазе людзі, у якіх ёсць працаздольныя дзеці.

Што тычыцца непасрэдна аплаты сацыяльных паслуг, то яна ажыццяўляецца на падставе дагавора аказання сацыяльных паслуг, які заключаецца з грамадзянінам (яго законным прадстаўніком) альбо іншай фізічнай і (або) юрыдычнай асобай у адпаведнасці з заканадаўствам.

***— Платныя сацыяльныя паслугі рэгламентаваны па часе. Умоўна, на прыборку — 30 хвілін. Гэта значыць, супрацоўнік цэнтра павінен укласціся ў гэтыя паўгадзіны і ўсё зрабіць?***

— Сацработнік павінен аказаць неабходныя паслугі ў адпаведнасці з зацверджанымі нарматывамі часу. Але, безумоўна, калі ён затрымаўся на 5-10 хвілін, ніхто з чалавека дадатковых грошай браць не будзе.

***— Ці хапае супрацоўнікаў у тэрытарыяльных цэнтрах для аказання такіх паслуг?***

— У нашым тэрытарыяльным цэнтры платныя сацыяльна-бытавыя паслугі для грамадзян, якія знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, аказваюць 55 сацыяльных работнікаў. Сёння ўсе заяўкі выконваюцца.

***— У пераліку платных паслуг ёсць пункт «садзейнічанне ў забеспячэнні лекавымі сродкамі паводле заключэння дактароў». У паліклініках чэргі. Сацыяльныя работнікі ў іх таксама сядзяць?***

— Наш тэрытарыяльны цэнтр наладзіў цеснае ўзаемадзеянне з установамі аховы здароўя Мазырскага раёна. Таму сацыяльныя работнікі, прад'явіўшы пасведчанне, маюць права на пазачарговае абслугоўванне ва ўсіх установах аховы здароўя.

***— Ці можа скарыстацца платнымі паслугамі не пажылы чалавек, а, скажам, маладая сям'я?***

— Без спагнання платы тэрытарыяльныя цэнтры аказваюць паслугі нянек сем'ям, якія выхоўваюць дзіця-інваліда да 4 гадоў, і сем'ям пры адначасовым нараджэнні дваіх і больш дзяцей. А, напрыклад, такія паслугі, як купля і дастаўка тавараў першай неабходнасці, прыборка або дапамога пры рамонце маладым сем'ям не аказваецца нават за плату — толькі непрацаздольным людзям або непрацаздольным сем'ям.

***— Ці аплачваецца праезд сацыяльным работнікам?***

— Так, нашым сацыяльным работнікам штомесяц аплачваецца праезд — гэта прадугледжана працоўным дагаворам.

***— Як трацяцца заробленыя сацыяльнымі цэнтрамі на платных паслугах грошы?***

— Сродкі, якія паступаюць ад аказання платных паслуг, выдаткоўваюцца на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстановы, матэрыяльнае стымуляванне работнікаў (прэмію) і абавязковыя плацяжы ў бюджэт.

**Святлана БУСЬКО.**

КАМЕНТАРЫЙ

**Начальнік аддзела развіцця і каардынацыі сацыяльнай дапамогі і сацыяльнага абслугоўвання ўпраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Мінпрацы і сацабароны Беларусі Таццяна ФЁДАРАВА:**

*— Тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва (ТЦСАН) аказваюць людзям паслугі, прадугледжаныя пералікам агульнадаступных сацыяльных паслуг, які быў зацверджаны ўрадам 27 снежня 2012 года. Гэты пералік досыць шырокі — так, беларусам прадастаўляецца каля 120 паслуг, якія з'яўляюцца агульнадаступнымі і бясплатнымі. Але асобным катэгорыям грамадзян паслугі прадастаўляюцца на ўмовах частковай або поўнай аплаты. Гэтыя пытанні рэгламентаваны Інструкцыяй аб парадку і ўмовах аказання сацыяльных паслуг дзяржаўнымі ўстановамі сацыяльнага абслугоўвання, зацверджанай пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі ад 26 студзеня 2013 года № 11.*

*Што тычыцца разавых сацыяльных паслуг, то іх пералік вызначаецца ў кожным рэгіёне. У кожнага тэрытарыяльнага цэнтра ён свой, зыходзячы з патрэб мясцовых жыхароў.*

*Для аказання такіх разавых паслуг у Цэнтрах у аддзяленнях тэрміновага сацыяльнага абслугоўвання ствараюцца гаспадарчыя брыгады. Па стане на 1 красавіка ў Беларусі ў 149-ці ТЦСАН маецца 78 такіх брыгад. За першы квартал гэтага года яны дапамаглі 2300 чалавекам. Гэтыя брыгады аснашчаюцца сродкамі механізацыі: мотаблокамі, газонакасілкамі, электра- і бензапіламі і інш.*

*Усяго за першы квартал гэтага года гаспадарчыя брыгады і сацыяльныя работнікі аказалі 77400 разавых сацыяльных паслуг для 24500 грамадзян.*

*Штатны расклад тэрытарыяльных цэнтраў гнуткі і фарміруецца, зыходзячы з запатрабаванняў. Іншымі словамі, колькасць сацыяльных работнікаў залежыць ад колькасці людзей, якія абслугоўваюцца. З павелічэннем колькасці людзей, якія знаходзяцца на абслугоўванні, будзе павялічвацца і колькасць сацработнікаў. Акрамя таго, мясцовым органам самакіравання дадзена права ўводзіць штатныя адзінкі па ўласным меркаванні. Новы закон аб сацыяльным абслугоўванні прадугледжвае ўвядзенне абсалютна новых сацыяльных паслуг. Таму мы прадугледзелі адпаведныя штатныя нарматывы для іх аказання.*

# МІР ВАМ!

**Класічная музыка — гэта вельмі сучасна, дакажуць на свяце мастацтваў у Мірскім замку**

**1 чэрвеня ў Мірскім замку 11-ы раз пройдзе свята мастацтваў пад лозунгам «Мірскі замак — гонар Беларусі і ЮНЕСКА».**

— Гэты фестываль для нас вельмі дарагі, таму што ён пабрацім фестывалю ў Нясвіжы, — тлумачыць **мастацкі кіраўнік свята прафесар Міхаіл ФІНБЕРГ**, — упершыню на свяце ў Міры пройдзе канцэрт аднаго творчага калектыву. Гэта ансамбль флейтыстаў пад кіраўніцтвам прафесара, доктара навук Уладзіміра Скараходава. Канцэрт працягнецца прыкладна паўтары гадзіны. Там жа, ва ўнутраным дворыку замка, традыцыйна прагучаць мірскія фанфары, менавіта тыя фанфары — мы знайшлі іх далёка за межамі нашай краіны. Асобна варта адзначыць, што ў гарадскім доме культуры пройдзе канцэрт, які мы прысвячаем Міхалу Клеафасу Агінскаму.

Канцэрт да 180-годдзя з дня смерці кампазітара «Міхал Клеафас Агінскі: памятаем і шануем» сапраўды абяцае быць надзвычай цікавым. У Мікалаеўскім касцёле Міра пройдзе канцэрт «Музыка беларускіх святынь» для струннага аркестра і вакальнага ансамбля Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі.

Завершыцца фестываль канцэртам «Вечар папулярнай песні ў Карэлічах», які пройдзе ў мясцовым Доме культуры.

**Зоя СВЕТЛАЯ.**

# ДНІ ВЯЛІКАГА БОКСА Ў МІНСКУ

**Беларуская сталіца другі раз у гісторыі рыхтуецца прыняць чэмпіянат Еўропы па боксе. Ужо заўтра адбудзецца афіцыяльнае лёсаванне і пройдуць першыя баі.**

На кантынентальны форум заявілася каля 300 спартсменаў з 36 краін Еўропы. Склад удзельнікаў турніру кажа сам за сябе. Напрыклад, на рынг сталічнага Палаца спорту выйдуць прызёры лонданскай Алімпіяды балгарын Тэрвел Пулеў і літовец Эвалдас Пятраўскас.

Сёлетні чэмпіянат пройдзе па новых правілах. Так, упершыню пры фарміраванні турнірнай сеткі будзе выкарыстаны пасеў, заснаваны на еўрапейскім рэйтынгу баксёраў. Гэта дазволіць выключыць магчымасць сустрэчы фаварытаў на ранніх стадыях спаборніцтваў. Як адзначыў **прэзідэнт Еўрапейскай канфедэрацыі бокса Франка ФАЛЬЧЫНЭЛІ,** зменіцца і прынцып судзейства. Вынік паядынку будзе залежыць не ад агульнай колькасці нанесеных удараў, а ад ацэнак суддзяў, выстаўленых па дзесяцібальнай шкале. Прычым будуць улічвацца ацэнкі толькі трох суддзяў з дзесяці, каб пазбегнуць спрэчных сітуацый.

Акрамя гэтага, на мінскім чэмпіянаце спартсмены ў апошні раз будуць выступаць у шлемах і «старых» пальчатках. Ужо на будучым чэмпіянаце свету, які пройдзе восенню ў Астане, баксёры выйдуць на рынг без шлемаў і ў пальчатках 10 і 12 унцый. Такія трансфармацыі ў баксёрскай экіпіроўцы тлумачацца тым, што ў наступных Алімпійскіх гульнях будуць прымаць удзел як спартсмены-аматары, так і прафесіяналы, якія, як вядома, выступаюць без шлемаў. «Мы павінны былі паставіць у аднолькавае становішча аматараў і прафесіяналаў, — пракаментаваў сітуацыю Франка Фальчынэлі.

Нашу краіну на кантынентальным форуме прадставяць 10 спартсменаў — Вадзім Кірыленка, Сяргей Лобан, Дзмітрый Сапон, Вазген Сафар'янц, Рустам Адзінаеў, Павел Кастрамін, Віталь Бандарэнка, Сяргей Новікаў, Сяргей Карнееў і Віктар Зуеў. Асаблівыя надзеі **старшыня беларускай федэрацыі бокса Дзмітрый ЦІХАМОЛАЎ** ускладае на нашых «сеяных» спартсменаў — сярэбранага прызёра Алімпійскіх гульняў у Афінах Віктара Зуева, прызёраў чэмпіянатаў свету і Еўропы Сяргея Карнеева і Вазгена Сафар'янца.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**

■ Еўразійская прастора



# АСТАНА: ЗВЕРКА ГАДЗІННІКАЎ

**29 мая 2013 года доўга чакалі палітыкі і эксперты па ўсім зямным шары. Менавіта ў гэты дзень прэзідэнты трох ключавых краін па стварэнні Еўразійскага эканамічнага саюза — Расіі, Беларусі і Казахстана — сустрэліся ў Астане, каб узгадніць асноўныя параметры гэтага будучага ўтварэння.**

Расія — найбуйнейшая па тэрыторыі краіна свету, уладальніца велізарнага ядзернага арсенала, член Савета бяспекі ААН, краіна, у якой ажыццяўляецца прамысловая здабыча ледзь ці не ўсіх магчымых відаў сыравіны. Казахстан вядомы як дзявятая па памеры тэрыторыі краіна свету і ўладальнік вялізных запасаў урану, нафты, газу, золата і іншых карысных выкапняў. Беларусь, хоць і валодае параўнальна невялікай тэрыторыяй і найменшым насельніцтвам у тройцы, тым не менш мае сур'ёзны навукова-тэхнічны і прамысловы патэнцыял і выгадна размешчана з пункту гледжання геапалітыкі.

Пры гэтым усе тры дзяржавы з'яўляюцца былымі рэспублікамі СССР, што з'яўляецца дадатковым фактарам, які распальвае інтарэс у свеце да новага інтэграцыйнага ўтварэння. Ці будзе яно імкнуцца да вяртання таго вялізнага ўплыву ў свеце, які меў Савецкі Саюз, і як яго з'яўленне адаб'ецца на цяперашнім сусветным балансе буйных дзяржаў і інтэграцыйных утварэнняў? Ці далучацца да яго іншыя былыя рэспублікі СССР, і якія менавіта?

Дадатковую інтрыгу сустрэчы надавала запрашэнне паўдзельнічаць у пасяджэнні Вышэйшага еўразійскага эканамічнага савета прэзідэнтаў Кыргызстана і Украіны. Пры гэтым, калі ў дачыненні да Кыргызстана ўсё ўжо было, у прынцыпе, зразумела — яго кіраўніцтвам было прынята прынцыповае рашэнне аб далучэнні да працэсаў еўразійскай інтэграцыі яшчэ ў 2011 годзе, то пытанне з удзелам Украіны так і заставалася загадкай. Украіна, другая па колькасці насельніцтва славянская краіна ў свеце, размешчаная паміж Еўрасаюзам і Расіяй, ужо больш як дзесяцігоддзе з'яўляецца полем для супрацьстаяння абодвух цэнтраў сілы. У Расіі цудоўна разумеюць, што еўразійская інтэграцыя без Украіны паўнавартаснай быць не можа, а Еўрасаюзу важна, каб Украіна заставалася на яго баку, не далучаючыся да сур'ёзных інтэграцыйных праектаў з Масквой.

Пасяджэнне Вышэйшага еўразійскага эканамічнага савета як апраўдала, так і не апраўдала ўсіх чаканняў. Шэраг пытанняў на ім былі вырашаны, а шэраг адкладзены на будучыню. З найбольш важных рашэнняў варта адзначыць пацвярджэнне, што Еўразійскі эканамічны саюз, як і дамаўляліся раней, уступае ў сілу з 1 студзеня 2015 года. Таксама было адзначана, што адначасова спыніць існаванне ЕўрАзЭС, як больш нізкая форма інтэграцыі. Украіна дамовілася, што далучыцца да Мытнага саюза ў якасці назіральніка. У дачыненні да Кыргызстана было пацверджана, што ён будзе ўдзельнікам еўразійскіх інтэграцыйных аб'яднанняў, як і было дамоўлена раней. Была дасягнута дамоўленасць аб унясенні змяненняў у рэгламент па пытанні дзейнасці Еўразійскай камісіі па правядзенні міжнародных перагавораў у сферы гандлю, падпісана пагадненне аб інфармацыйным узаемадзеянні ў сферы статыстыкі. Таксама прынята рашэнне аб асноўных арыенцірах макраэканамічнай палітыкі ўдзельнікаў аб'яднання на 2013—2014 гады і дасягнута дамоўленасць аб канцэпцыі ўзгодненай аграпрамысловай палітыкі дзяржаў — членаў Мытнага саюза і ЕЭП. Будуць таксама прыкладзены сур'ёзныя намаганні па стварэнні інтэграванай інфармацыйнай сістэмы знешняга і ўзаемнага гандлю Мытнага саюза. Яна дапаможа мець больш дакладную інфармацыю аб аб'ёмах гандлю і відах тавараў, што важна пры распрацоўцы агульных стратэгій і канцэпцый.

Да тых пытанняў, па якіх пакуль не ўдалося ўзгадніць асноўныя пазіцыі, прэзідэнты прынялі рашэнне вярнуцца падчас двух наступных пасяджэнняў Вышэйшага еўразійскага эканамічнага савета — у кастрычніку ў Мінску і ў снежні ў Маскве. Тое, што рашэнне іх было адкладзена, не з'яўляецца падставай для песімізму. Еўразійскі эканамічны саюз ствараецца надоўга, і гарантыяй яго трываласці з'яўляецца старанны ўлік усіх спрэчных пазіцый і дасягненне разумных кампрамісаў па кожнай з іх. Залішняя паспешлівасць на цяперашнім этапе немэтазгодная.

Акрамя сустрэчы ў рамках Вышэйшага еўразійскага эканамічнага савета, Прэзідэнт Беларусі прыняў удзел у двухбаковай сустрэчы з Прэзідэнтам Казахстана Нурсултанам Назарбаевым. Ні для каго не сакрэт, што як асабістыя ўзаемаадносіны прэзідэнтаў, так і беларуска-казахстанскія адносіны ўяўляюць сабой прыклад сапраўднай дружбы. Нягледзячы на тысячы кіламетраў, што раздзяляюць краіны, заўсёды ідзе абмеркаванне дзясяткаў перспектыўных праектаў, у дачыненні да некаторых з іх краіны ўжо распачалі супрацоўніцтва. Адна з галоўных задач Казахстана — выбудаваць сучасную індустрыяльную базу для паступальнага развіцця сваёй эканомікі — знаходзіць поўнае разуменне і падтрымку ў Беларусі. У яе рэалізацыі актыўна ўдзельнічаюць буйныя беларускія прадпрыемствы, якія ўзводзяць зборачныя прадпрыемствы на казахстанскай зямлі. Прэзідэнт Беларусі ў гэтай сувязі адзначыў: «У нас нямала праектаў і амаль няма ніякіх праблем у іх рэалізацыі. Гэта сведчыць пра ўзровень нашага супрацоўніцтва». Добры патэнцыял ёсць і ў развіцці тавараабароту. Толькі за 2012 год Беларусі ўдалося ажыццявіць пастаўкі па 116 новых відах экспарту, а ўсяго іх колькасць дасягнула 544. Тавараабарот па выніках 2012 года склаў 942,8 млн долараў, а з улікам паслуг (99,8 млн долараў) аб'ём знешняга гандлю перасягнуў знакавую мяжу ў мільярд долараў. Важным для Беларусі з'яўляецца тое, што на працягу апошніх пяці гадоў дадатнае сальда тавараабароту пастаянна расце, што карысна для нашай краіны па прычыне неабходнасці прытоку замежнай валюты.

Адной з галоўных перспектыў будучыні з'яўляецца прыцягненне казахстанскіх партнёраў да рэалізацыі інвестыцыйных праектаў на тэрыторыі Беларусі. Казахстан, у сілу нарастальнага экспарту прыродных рэсурсаў, валодае сур'ёзнымі валютнымі рэзервамі, частка з якіх можа паслужыць для мадэрнізацыі беларускіх прамысловых прадпрыемстваў. Гэта дазволіць больш цесна звязаць эканомікі дзвюх краін, што будзе пазітыўна ўплываць і на эканамічнае супрацоўніцтва ў рамках еўразійскіх інтэграцыйных працэсаў. Важным фактарам для далейшага развіцця тавараабароту з'яўляецца і перапрацоўка казахстанскай нафты на беларускіх нафтаперапрацоўчых заводах, якая плануецца ў будучыні. Акрамя гэтага, ёсць сур'ёзныя перспектывы і ў планаў па стварэнні сумесных беларуска-казахстанскіх карпарацый, якія будуць рэалізоўваць маштабныя праекты на сусветнай арэне.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук**

■

## ПАНЦЯЛЕЕЎ І ЯГО СЯБРЫ

У рамках Дзён культуры Беларусі ў Польшчы ў дзяржаўнай галерэі горада Сопат адкрылася выстава сучаснага беларускага мастацтва «Панцялееў і яго сябры». У залах галерэі на плошчы ў 1000 квадратных метраў прадстаўлена больш за 200 твораў скульптуры, жывапісу і графікі беларускіх аўтараў Уладзіміра Панцялеева, Андрэя Вараб'ёва, Ігара Засімовіча, Уладзіміра Голуба, Васіля Касцючэнкі, Аляксандра Сільвановіча і Валянціны Шобы. Адна з найбуйнейшых прэзентацый сучаснага беларускага мастацтва ў Польшчы — вынік шматгадовага супрацоўніцтва Гродзенскай выставачнай залы і Сопацкай галерэі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Открытого акционерного общества «Минский вагоноремонтный завод» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества БАЗЫ ОТДЫХА в составе: двухэтажного бревенчатого здания базы отдыха** с двумя бревенчатыми одноэтажными пристройками, общей площадью **918.9 кв.м** (инв. № 623/С-415), **кирпичной уборной, деревянным сплошным забором, забором из металлической сетки, колодцем из ж/б колец, газоном, насаждениями многолетними**.

База отдыха расположена по адресу: **Минская область, Узденский район, Неманский с/с, аг. Могильно, ул. Школьная, 8,** площадь земельного участка – **1.5184 га** (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования).

**Начальная цена с НДС – 298 252 507 бел. руб.**

**Задаток 10% от начальной цены (29 825 000 бел. руб.) перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012108260016; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на р/с: в евро (EUR) – 3012108260032; в долларах США (USD) – 3012108260029; в российских рублях (RUB) – 3012108260045; в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

**Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.**

Аукцион состоится **09.07.2013** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.07.2013** до 12.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.**

■ Надвор'е

## НА ВЫХАДНЫЯ СУР'ЁЗНЫ ДОЖДЖ, НАВАЛЬНІЦЫ І НАВАТ ГРАД

**У бліжэйшыя суткі на тэрыторыю Беларусі будзе паступаць цёплае і няўстойлівае паветра з боку Чорнага мора, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Таму сёння будзе пераменная воблачнасць, удзень месцамі па краіне, а ў Брэсцкай вобласці паўсюдна пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах — навальніцы. У Брэсцкім рэгіёне часам дажджы моцныя і ўзмацненні ветру парывамі да 15-18 м/с. Максімальная тэмпература паветра ўдзень — 23-29, па паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці — толькі 20-22 цяпла.

У суботу і нядзелю Беларусь трапіць пад уплыў актыўнага маларухомага фронту. Паўсюдна чакаюцца кароткачасовыя дажджы, **месцамі моцныя лівні, навальніцы, а ў асобных раёнах магчымы град. Пры навальніцах узмацненне ветру парывамі да 15-20 м/с.** Тэмпература паветра ў ноч на выхадныя 11-17, на паўднёвым захадзе — плюс 8-10 градусаў. У суботу ўдзень будзе яшчэ даволі цёпла — плюс 19-25, у паўночна-ўсходніх рэгіёнах — да 28 цяпла. У нядзелю — 22-28 градусаў, на поўдні — да 18-21 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ**

■

■ Розгалас

## СОМА НЕ ЛАВІЦЬ, ЁН ПАД ЗАБАРОНАЙ

**У адпаведнасці з Правіламі вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства, з 31 мая па 1 ліпеня ў рыбалоўных угоддзях устанаўліваецца забарона на здабычу звычайнага сома.**



— Сом нерастуе пазней за асноўную масу ўсіх рыб Беларусі, што нерастуюць увесну, паколькі тэмпература вады для яго камфортнага размнажэння павінна быць не ніжэй за 16 градусаў. Нерастуе сом не ў адзін, а ў некалькі прыёмаў, — распавяла прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч.

Сом — самы буйны прэснаводны драпежнік у водах Беларусі, каштоўная прамысловая рыба. Дзякуючы рыбаахоўным мерапрыемствам сёння ён выключаны з Чырвонай кнігі і пражывае практычна ва ўсіх вялікіх рэках і азёрах краіны. За лоўлю сома ў забаронены час можна атрымаць штраф у памеры ад 10 да 50 базавых велічынь (1-5 мільёнаў рублёў). Таксама такса для вызначэння памеру пакрыцця шкоды, нанесенай навакольнаму асяроддзю фізічнымі і юрыдычнымі асобамі ў выніку незаконнага вылаву ці знішчэння сома (адна базавая велічыня — 100 тысяч рублёў), у перыяд забароны на яго лоўлю вылічваецца ў трайным памеры і складае тры базавыя велічыні (300 тысяч рублёў).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ДЗЯЦЕЙ НАРАДЖАЕЦЦА БОЛЬШ...

**Па стане на 1 мая 2013 года колькасць насельніцтва Беларусі складала 9 459,1 тыс. чалавек (мінус 4,7 тысячы чалавек у параўнанні з пачаткам гэтага года).**

Па звестках Нацыянальнага статыстычнага камітэта, у студзені—красавіку 2013 года ў краіне нарадзіліся 37 158 дзяцей, што на 2 102 больш, чым за адпаведны перыяд 2012 года. А памерлі за першыя чатыры месяца бягучага года — 45 048 чалавек, што на 1 882 чалавекі больш, чым у студзені—красавіку 2012 года. Такім чынам, натуральныя страты насельніцтва склалі 7 890 чалавек.

Колькасць зарэгістраваных у студзені—красавіку 2013 года шлюбаў у параўнанні з аналагічным перыядам 2012 года павялічылася на 14,7%, а колькасць скасаваных шлюбаў, наадварот, зменшылася на 12,3%. У студзені—красавіку 2012 года на 1 000 зарэгістраваных прыйшлося 576 скасаваных шлюбаў.

Міграцыйны прырост у студзені—красавіку 2012 года ў параўнанні з аналагічным перыядам 2012 года павялічыўся на 47,6% і склаў 3 181 чалавек. Станоўчае сальда міграцыі зменшыла натуральныя страты насельніцтва нашай краіны на 40,3% .

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ТУТ НЕ КУРАЦЬ

**Ужыванне тытуню — другая пасля гіпертэнзіі прычына смерці ў глабальным сэнсе, і сёння ад гэтага памірае адзін з дзесяці дарослых ва ўсім свеце.**

Даказана, што тытунь з'яўляецца адным з асноўных фактараў рызыкі развіцця раку, хваробы лёгкіх і сардэчна-сасудзістых захворванняў, паведамляюць у Рэспубліканскім цэнтры гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя. Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь сур'ёзна занепакоена праблемай курэння тытуню, асабліва сярод моладзі. Таму ў гэтыя дні праводзіцца рэспубліканская інфармацыйна-адукацыйная акцыя «Беларусь супраць тытуню». А яшчэ міністэрства выступіла з ініцыятывай стварэння нарматыўна-прававога акта, які рэгуляваў бы грамадскія стасункі ў гэтай галіне. Плануецца ўвесці поўную забарону на курэнне ва ўстановах адукацыі, культуры, спорту, аховы здароўя, грамадскага харчавання, на вакзалах, у транспарце і на працоўных месцах.

Паводле вынікаў рэспубліканскага сацыялагічнага даследавання, праведзенага летась, у Беларусі курыць 30,5 працэнта насельніцтва (у 2001-м — каля 42 працэнтаў ). Калі вы хочаце кінуць курыць, звярніцеся да ўрача-нарколага (Мінскі гарадскі клінічны наркалагічны дыспансер, Мінскі абласны клінічны цэнтр «Псіхіятрыя-наркалогія», іншыя абласныя наркадыспансеры).

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## З МАШЫНЫ ЎКРАЛІ ПАРТФЕЛЬ...

**У Мінску затрымалі падазронага ў крадзяжы з прыпаркаванага аўтамабіля партфеля з 30 мільёнамі.**

У Цэнтральны РУУС сталіцы патэлефанаваў усхваляваны мужчына, які распавёў, што з яго легкавіка знік партфель, дзе былі грошы і дакументы. Як высветлілася, «Таёту» пацярпелы пакінуў на стаянцы каля буйнога гандлёвага цэнтра — непадалёку ад месца працы. Толькі чамусьці непрадбачліва пакінуў на заднім сядзенні машыны партфель, дзе было, апроч іншага, 30 мільёнаў рублёў. Бліжэй да абеду мужчына вярнуўся да легкавіка і ўбачыў, што задняе бакавое шкло разбіта... Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку даволі аператыўна ўстанавілі падазронага ў здзяйсненні крадзяжу. Да яго меў дачыненне раней неаднаразова судзімы за аналагічныя злачынствы 33-гадовы мінчанін. Заведзена крымінальная справа, праводзіцца расследаванне.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## КУПЛЯЎ МАБІЛЬНЫЯ ПА ЧУЖЫХ ПАШПАРТАХ

**Упраўленнем Следчага камітэта па Віцебскай вобласці завершана расследаванне крымінальнай справы, распачатай у дачыненні да 28-гадовага жыхара Віцебска, які на працягу некалькіх месяцаў афармляў куплю мабільных тэлефонаў у растэрміноўку, выкарыстоўваючы чужыя пашпарты.**

— Абвінавачаны шукаў у абласным цэнтры грамадзян, якія пагаджаліся за грашовую ўзнагароду — 50 000 беларускіх рублёў — прадаставіць свой пашпарт для афармлення на іх імя куплі мабільнага тэлефона ў растэрміноўку. Мужчына ўносіў першапачатковую суму, выплачваў грашовую ўзнагароду за аказаную паслугу, браў на сябе абавязацельства па выплаце растэрміноўкі, пасля чаго ад'язджаў у Расію, дзе рэалізоўваў мабільны тэлефон па больш высокай цане, — расказала **Іна ГАРБАЧОВА, афіцыйны прадстаўнік упраўлення Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці**. — Узятыя на сябе абавязацельствы па выплаце растэрміноўкі, ён, зразумела, выконваць не збіраўся, а пасля рэалізацыі набытых тавараў ухіляўся ад сустрэчы з падманутымі грамадзянамі. Апошнія шукалі махляра ў сувязі з атрыманнем так званых прэтэнзійных лістоў з указаннем аб наяўнай запазычанасці па растэрміноўцы за набыты тавар.

Судом Першамайскага раёна махляру прызначана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на 4 гады з канфіскацыяй маёмасці.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■

## НЯДЗЕЛЯ, 9 ЧЭРВЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**7.25 Камедыя «Афоня».**
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 Арсенал.
**9.40, 0.20 Серыял «Татулі».**
10.45 Ураджайныя тайны.
11.15 Зона Х. Вынікі тыдня.
11.45 Нашы.
**12.15 Прытча-казка «Звычайны цуд».**
15.15 Навіны рэгіёна.
**15.30 Анімацыйны фільм «Вольт».**
17.15 Заўтра — гэта мы!
17.55 «Мая праўда». «Уладзімір Этуш».
**19.00 Камедыя «Шопагалік».**
21.00 У цэнтры ўвагі.
21.55 Журналісцкае расследаванне.
**22.30 Трылер «Цёмная вада».**

### АНТ

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
9.05 Нядзельная прапаведзь (з субцітрамі).
9.20 «Смяшарыкі».
9.35 «Бесталковыя нататкі».
9.55 «Пакуль усе дома».
10.50 «Фазэнда».
11.25 «Эх, был бы я полегкомысленнее...».
**12.25 Меладрама «Вакзал для двух».**
15.00 Людміла Гурчанка. «Як я стала багіняй».
16.15 Навіны спорту.
16.20 Асяроддзе пражывання. «Час кватэрнай платы».
17.20 «Форд Баярд».
18.45 «Эстрадны кактэйль».
20.00 Контуры.
**21.05 Маст. фільм «Лары Краўн».**
**22.50 Камедыя «Адзін удоўны дзень».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.45 Маст. фільм «Бусляня».**
8.30 М/ф «Чабурашка», «Чабурашка ідзе ў школу», «Шапакляк».
9.20 Пазакласная гадзіна.
9.40 Тэлебарометр.
9.45 Пра мастацтва.
**10.15 Трагікамедыя «Кін-дза-дза».**
**12.40 Меладрама «З каханнем, Ліля».**
**14.40 Камедыя «Нянька-2».**
**16.40 Маст. фільм «Зялёны фургон».**
19.15 Суперлато.
20.25 Навіны надвор'я.
21.00 Спортлато 5 з 36.
21.05 КЕНО.
**21.10 Трылер «У цемры».**
22.55 Спорт-кадр.
23.35 Імперыя песні. Суперфінал.

### СТБ

**6.10 «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.**
7.55, 12.45, 17.20, 22.30 Красуні! Міс Мінск 2013.
**8.00 Трылер «Ілюзіяніст».**
10.00 «Аўтапанарама».
10.30 «Тайны свету. Выкрыццё».
11.30 «Вялікае снеданне».
12.10 «Добры дзень, доктар».
**12.50 Камедыя «Ты — мне, я — табе».**
14.25 «Тэрыторыя памылак».
16.00 «Цэнтральны рэгіён».
16.30 «24 гадзіны».
16.50 «Аўтапанарама».
17.25 Канцэрт Міхаіла Задорнава.
19.30 «Тыдзень».
**20.40 Маст. фільм «Мой лепшы сябар».**
22.35 «Якія людзі!».
**23.35 Маст. фільм «Тайна Обервальда».**
1.50 «Уся праўда пра Апакаліпсіс».

### МІР

**5.00 Маст. фільм «Трактарысты».**
6.30 М/ф.
7.35 «Мільён пытанняў пра прыроду».
7.50 М/с «Смяшарыкі».
8.05 «Ведаем рускую».
9.00, 15.00, 18.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
9.10 Дак. фільм «Прыцягненне полюса».
**10.05, 23.05 Маст. фільм «Чырвоная палатка».**
**12.45, 1.45 Маст. фільм «Тонкія ніткі кахання».**
15.10 Ток-шоу «Яшчэ не разам».
**15.50 Серыял «Вочы Вольгі Корж».**
20.00 «Разам».
**21.30 Маст. фільм «Дэльфійскі эфект».**
4.00 «Цуркі Расіі».

### 8 КАНАЛ

9.00, 12.25, 18.45, 21.05, 23.55 «Надвор'е».
9.05, 16.20 Мультпарад.
9.15 «Кінаблакнот».
9.30 «Мой любімы гадаванец».
10.00 «Адшукваецца адпачынак».
**10.30 «Сінематограф». Маст. фільм «Трон у крыві».**
**12.30 Баявік «Жыві і дай памерці».**
**14.35 Серыял «Камісар Рэкс».**
15.05 «Судовы дэтэктыў».
16.10 «Выратавальнікі».
**16.40 Серыял «Масква. Цэнтральная акруга».**
18.25 Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень.
19.00 «Сёння. Падагульняючая праграма».
20.00 Чыстасардэчнае прызнанне.
20.40 «Цэнтральнае тэлебачанне».
21.45 «Жалезныя лэдзі».
**22.30 Серыял «Ліцейны».**
1.00 «Школа зласлоўя». Ток-шоу.

### ВТБ

6.00, 1.00 «PLAY».
**8.30 Серыял «Татавы дочкі».**
9.30, 16.30 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
10.30, 13.00, 0.00 «Улётнае відэа».
11.00 «Вясельная сукенка».
11.30 «З'ешце гэта неадкладна».
12.00, 20.00, 23.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
12.30, 0.30 Скетч-шоу «Анекдоты».
13.30, 20.30 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
14.00 «Жонкі алігархаў».
**15.00 Серыял «Васьмідзясятыя».**
17.00 «Кіно ў дэталях».
18.00 «Людзі Хэ».
19.00 «Нерэальная гісторыя».
21.00 «Уральскія пельмені».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00 Маст. фільм «Белая варона».**
10.10 «Сам сабе рэжысёр».
11.00, 14.00 Весткі.
11.15 «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
11.45 «У свеце жывёл».
**12.20 Маст. фільм «Я цябе ніколі не забуду».**
14.15 «Уся Расія».
14.30 «Чорныя дзіркі. Белыя плямы».
15.20 «Гарадок».
**16.15 Маст. фільм «Бабіна лета». 2-я серыя.**
18.00 «Смяяцца дазваляецца».
20.00 Весткі тыдня.
**21.25 Маст. фільм «Мой тата лётчык».**
23.20 «Нядзельны вечар».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.25 Серыял «Злачынства будзе раскрыта».**
8.00, 10.00, 13.00 Сёння.
8.20 «Медыцынскія тайны».
8.50 «Іх норавы».
9.25 «Ядзім дома!».
10.20 «Першая перадача».
10.50 «Дачны адказ».
11.55 «Паедзем, паядзім!».
12.25 «Цуд тэхнікі».
13.20 «Следства вялі...».
14.10 «Вочная стаўка».

### ІНТЭР+

**7.35, 1.55 Маст. фільм «Хачу Вашага мужа».**
8.45 Формула кахання.
9.30 Школа доктара Камароўскага.
**10.05 Серыял «Міліцэйская акадэмія».**
10.55, 23.20 Смачнае спатканне.
11.40, 3.50 Арол і рэшка.
**12.30 Маст. фільм «Бераг яго жыцця».**
15.40 Канцэрт групы «ТИК».
**16.50 Маст. фільм «Заграва».**
**18.20, 4.40 Маст. фільм «Цёмная ноч».**
20.00, 3.00 Падрабязнасці тыдня.
**20.50 Маст. фільм «Крымінальны талент».**
**0.05 Маст. фільм «Цудоўная хлусня».**
1.40 Краіна смяецца.
6.20 Дак. фільм «Хроніка абрабаванняў».

### КУЛЬТУРА

5.30 «Еўраньюс».
9.00 «Звычайны канцэрт».
**9.35 «Тайна залатой гары». Маст. фільм.**
10.45 Да 70-годдзя Алега Відава. «Легенды сусветнага кіно».
11.10 Расія, любоў мая! «У гасцях у эскімосаў і чукчаў».
**11.40 «Ох, ужо гэта Насця!». Маст. фільм.**
12.50 «Сабака ў ботах». М/ф.
13.10, 23.50 «Жывая прырода Францыі». Дак. серыял.
14.05 «Што рабіць?».
14.55 «Хто там...».
15.20 Горан Брэгавіч і яго фестывальны аркестр у Антычным тэатры Ліёна.
16.10 «Ноч у музеі».
17.00 «Кантэкст».
**17.40 «Валянціна». Маст. фільм.**
19.15 Хрустальны баль «Хрустальнай Турандот» у гонар Іны Чурыкавай.
21.05 «Падводная імперыя». Дак. серыял.
21.50 «Шэдэўры сусветнага музычнага тэатра». Аньес Летэсцю і Жазэ Марцінез у балеце «Пахіта».
0.40 «Трус з капуснага агарода». М/ф для дарослых.
0.55 «Шукальнікі». «Ахвяра смутнага часу».
1.40 «Сусветныя скарбы культуры».

### НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «Гэта вы можаце». 1992 год.
5.50 «Ранішняя пошта». 1992 год.
**6.30, 0.40 «Бумбараш». Маст. фільм.**
7.45, 19.45, 1.45 «Прыгоды капітана Врунгеля». М/ф.
8.00, 2.00 «Час».
9.00 «Колба часу».
10.00 «Кінасерпанцін». 1990 год.
11.00 «Быў час». 2009 год.
12.00 «Вакол смеху». 1986 год.
13.30 «Гісторыя аднаго бенефісу. Шоу Бары Алібасава». 1991 год.
15.00 «Залатая рыбка». Тэлеспектакль. 1986 год.
16.35 «Спявае Карэл Гот». Фільм-канцэрт. 1980 год.
17.05 «Генадзь Гладкоў». Дак. фільм.
18.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
19.00 «Эстрадны вернісаж». 1991 год.
20.00 «Тэатральныя сустрэчы» «За сіняй птушкай». 1967 год.
21.50 «Мелодыі і рытмы замежнай эстрады». 1988 год.
23.00 «Кубінскія партрэты». Дак. фільм.
0.10 «Падарожжа з песенькай». 1986 год.
4.00 «Аншлаг? Аншлаг!». 1990 год.

### ПЯТНІЦА

5.00 «Звярыны атрад. Код Марка Пола». М/ф.
6.50 М/ф.
9.00 Добры вечар, жывёлы!
**10.00 «Рыжыя». Серыял.**
12.00 Людзі Пятніцы.
13.00, 20.00 Вялікая розніца.
**14.00 «Гары Потэр і філасофскі камень». Маст. фільм.**
**17.00 «Гары Потэр і кубак агню». Маст. фільм.**
21.00 Пародайс.
22.00 Канікулы ў Мексіцы.
3.30 Music.

### EUROSPORT

9.00, 12.00 Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг.
9.25, 2.10 Спартыўны часопіс.
9.30 Тэніс. Roland Garros. Фінал. Жанчыны.
10.30, 15.55, 18.30, 23.15 Тэніс. Гейм, сэт і Матс.
10.45, 15.00 Веласпорт. Крытэрыум дзю Дафіне.
11.45 Аўтаспорт. Патрык Дэмпсі ў гонцы Ле Ман 24 гадзіны.
14.00, 0.15 Супербайк. Чэмпіянат свету.
16.00, 22.00, 1.15 Тэніс. Roland Garros. Фінал. Мужчыны.
18.45 Вось гэта дзіва!!! Спецыяльны выпуск.
19.00 Снукер. Еўрапейскі тур.
20.00 Снукер. Еўрапейскі тур. Фінал.
23.30 Мотаспорт. Суперспорт. Чэмпіянат свету.
1.00, 2.15 Мотаспартыўны часопіс.

### НАША КІНО

6.30, 12.30 Маст. фільм «Канец імператара тайгі».
8.00 Плюс кіно.
8.30, 14.30 Драма «Дзіўныя мужчыны Сямёнавай Кацярыны».
11.00, 17.00 Маст. фільм «Марыца».
18.30, 0.30 Драма «Букет мімозы і іншыя кветкі».
20.00, 2.00 Кінафантазія «Фа мінор».
20.30, 2.30 Маст. фільм «Развітанне з Пецярбургам».
22.30, 4.30 Меладрама «Бацькоў не выбіраюць».

### ДОМ КІНО

3.00 Лірычная камедыя «Прадаецца дача».
4.35 Драма «Зямля людзей».
6.25, 8.20, 16.55, 18.50, 2.00 «Акно ў кіно».
6.30, 17.00 Серыял «Ліст чакання».
7.30, 18.00, 2.05 Серыял «Уцёкі-2».
8.30 Экранізацыя школьнай праграмы. Н. Гогаль «Запіскі вар'ята».
9.30 Кароткаметражны фільм «Апошні дзень Булкіна І.С».
9.50 Новы хіт. Трагікамедыя «Пазаземны».
12.05 Камедыя «Навагодні пярэпалах».
15.35 Камедыя «Дзе знаходзіцца «нофелет»?».
19.00 Камедыя «Хто прыходзіць у зімовы вечар...».
20.40 Золата «Масфільма». «Формула кахання».
22.10 Дэтэктыў «Чалавек, які сумняваецца».
23.35 Камедыя «Ліфт для прамежкавага чалавека».

### КАМЕДЫЯ

5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05 «Паміж намі».
5.20, 12.55, 21.00 Маст. фільм «Вечар у тэатры».
5.50, 13.30, 21.30 Маст. фільм «Мейбл за рулём, або Гарачы фінал».
6.15 Маст. фільм «Мой слуга Годфры».
8.00, 16.00, 2.20 Маст. фільм «Лячэнне».
8.30, 16.30, 2.50 Маст. фільм «У парку».
8.45, 10.40, 13.45, 16.45, 21.50, 3.05 «Камедыянты. Лепшае».
9.00 Маст. фільм «K-9 — сабачая праца».
11.15 Маст. фільм «Сямейны план».
14.10 Маст. фільм «Птушачка на провадзе».
17.20 Маст. фільм «Магутныя качаняты».
19.20 Маст. фільм «Подыум».
22.10 Маст. фільм «Як выкрасці мільён».
0.15 Маст. фільм «Спатканне маёй мары».
3.25 Маст. фільм «Хатняя гаспадыня».

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

2.00, 8.00, 14.00 Маст. фільм «Апошняе лета дзяцінства». 3-я серыя.
3.05, 9.05, 15.05 М/с «Баба-Яга супраць!». Рускія народныя казкі. «Царэўна-жаба».
4.00, 10.00, 16.00 М/с «Апошні з магікан». Казкі Пушкіна. «Казка пра рыбака і рыбку».
5.00, 11.00, 17.00 Казкі рускіх пісьменнікаў. «Дванаццаць месяцаў». М/ф «Страла ляціць у казку».
6.30, 12.30, 18.30 М/с «Легенда пра спячую прыгажуню».
7.00, 13.00, 19.00 «Урокі цётачкі Савы». Зборнік м/ф «Шчаня і старая тапачка», «Чарадзейныя акуляры».

### ТЭЛЕКЛУБ

20.00 Серыял «Колер полымя».
21.00 Серыял «Целаахоўнік-4».
22.00 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
23.00 Серыял «Агент нацыянальнай бяспекі-4».
0.00 Серыял «Рускае лякарства».
1.00 Серыял «Аўтобус».

### ТБ3

6.00 М/ф.
8.15, 5.10 «Планета Зямля».
9.05 «Індзіяна Джонс і Каралеўства хрустальнага чэрапа». Маст. фільм.
11.15, 2.55 «Некалькі дзён з жыцця І.І. Абломава». Маст. фільм.
13.45 «М+Ж». Маст. фільм.
15.20, 1.20 «Абацтва Даўнтан». Серыял.
17.15 «Гары Потэр і Кубак агню». Маст. фільм.
20.25 «Дзень Незалежнасці». Маст. фільм.
23.10 «Каліфрэнія». Серыял.
0.20 «Быць чалавекам». Серыял.

### ТБ1000

5.00 Анімацыйны фільм «Палярны экспрэс».
6.50 Драма «Марыя-Антуанэта».
9.00 Драма «Целаахоўнік».
10.50 Камедыя «Знаёмства з Факерамі».
12.55 Фільм жахаў «Выбар кілера».
14.30 Камедыя «Мацярынства».
16.15 Меладрама «Святло вакол».
18.10 Фантастыка «Вайна светаў».
20.10 Баявік «Воін».
22.40 Камедыя «Мексіканец».
0.55 Маст. фільм «Доказ жыцця».
3.20 Меладрама «Каханне, якое збівае з ног».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.00 Камедыя «Тры плюс два».
8.00 Меладрама «Бясконцыя мары аб шчасці».
9.30 Трылер «Якая бяжыць па хвалях».
12.00 Дэтэктыў «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана. 20 стагоддзе пачынаецца».
14.55 Баявік «Выкрадальнікі кніг».
16.30 Камедыя «Нядбайнік».
18.05 Камедыя «Клушы».
20.00 Трагікамедыя «Навобмацак».
22.00 Маст. фільм «Рускае».
0.10 Камедыя «Нявеста любой цаной».
2.00 Меладрама «Варачка».
4.00 Камедыя «Інтымнае жыццё Севасцьяна Бахава».

### ІЛЮЗІЁН

1.20 Мядовы месяц Камілы.
2.50 ЗащитнеГ.
4.30 Каханне і іншыя акалічнасці.
6.10 Рэальныя дзяўчаткі.
7.45 Міс ніхто.
9.15 Мой адзіны.
11.05 10 крокаў да поспеху.
12.25 Ён быў ціхонем.
13.55 Міф.
16.00 Фей Грым.
18.00 Іншы мужчына.
19.30 Ілжывая спакуса.
20.55 Перамотка.

### «CBS DRAMA»

7.00 Стол на траіх.
7.50 Тайны айца Даўлінга.
12.00 Дыягназ: Забойства.
16.10 Хутчэй за ўсё забойства.
17.50 Дынастыя.
22.00, 3.00 Дзеці майго сэрца.
23.40 4400.
4.35 Смачнае захапленне плюс.
6.10 Без вестак зніклая.

### AXN-SciFi

0.20, 8.50 Мерлін.
1.05, 19.45 Партал юрскага перыяду: Новы свет.
1.50, 4.10, 6.30, 10.20 Ван Піс.
2.40, 5.00, 11.15 На краі Сусвету.
7.20 Кліч крыві.
12.50 Чорная лагуна.
16.45 Тайнае кола.
18.15 Мёртвыя, як я.
20.30 Дзённікі вампіра.
22.45 Каўчэг.

***У праграме магчымыя змяненні. Передрукоўка праграмы забаронена!***

### NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00, 11.00, 1.00, 4.00 Шаша праз пекла.
6.00 Адысея вялікіх котак.
7.00 Следства па справах драпежнікаў.
8.00 80-я: дзесяцігоддзе, якое стварыла нас.
9.00 З пункту гледжання навукі.
10.00 Няўлоўная котка.
12.00 Золата горада-прывіда.
13.00 Пакінутыя.
14.00 Анаконда.
15.00 Паляванне на паляўнічага.
16.00 Выпрабуйце свой мозг.
19.00 Расследаванні авіякатастроф.
20.00, 23.00, 2.00 Скарбашукальнікі.
21.00, 0.00, 3.00 Аўта-SOS.
22.00 Мегазаводы.

### DISCOVERY

7.00, 10.05 Як гэта ўстроена?
7.25 Маланкавыя катастрофы.
8.15, 3.30 Вынайсці будучыню.
9.10, 16.25, 21.00 Лабараторыя для мужчын.
10.30, 4.45 Як гэта працуе?
11.00, 19.10 Экстрэмальная рыбалка.
11.50 Залатая ліхаманка.
12.45 Рыбалка голымі рукамі.
13.40, 0.55 Гісторыя электрычнасці.
14.35, 0.00 Скрозь кратовую нару.
15.30, 1.50 Сусвет Сцівена Хокінга.
20.05 Адпетыя рыэлтары.
22.00 Прасцяк за мяжой.
23.00, 2.40 Самае страшнае.
4.20 Маланкавыя катастрофы.
5.10 Вялікі махінатар.
6.05 Махінатары.

### ANIMAL PLANET

7.00 Маёнтак сурыкатаў.
7.25 Уводзіны ў сабаказнаўства.
8.15 Паляўнічы на кракадзілаў.
9.10 Як выгадаваць гепардаў.
10.05 Рай для шымпанзэ.
10.30 Дзік і Дом спяшаюцца на дапамогу.
11.00, 15.30 Ветэрынар Бандай Біч.
11.25 Самае дзікае шоу.
11.55, 5.45 Нязведаныя астравы.
12.50 Ільвіны рык.
14.40 Шамвары: жыццё на волі.
16.30 Мой гадаванец — зорка інтэрнэту.
17.25 Пякельная котка.
18.20 Утаймавальнік па выкліку.
19.15 Як выжыць жывёлам?
20.10 Перакладчык з сабачай.
21.05, 2.25 У нетрах Афрыкі.
22.00, 3.15 Жыццё.
22.55, 4.05 60 самых небяспечных істот.
23.50 Дзікія і небяспечныя.
0.45 У пячору льва.
1.35, 4.55 Паліцыя Філадэльфіі — аддзел па абароне жывёл.
6.35 SOS дзікай прыроды.

### ЗДАРОЎЕ

5.00, 18.35, 2.00 Сімптомы і ілюзіі.
5.30, 19.05, 2.30 Прырода, якая вылечвае.
6.00, 18.35, 3.00 Касметолаг і я.
6.30, 20.05, 3.30 Асцярожна: падлетак!
7.00, 20.35, 4.00 Зона рызыкі.
7.30, 21.05 Як прадоўжыць маладосць і захаваць энергію.
8.00, 21.35 Зялёная аптэка.
8.30, 22.05 Выдаткі вытворчасці.
9.00, 22.35 Не выходзячы з дома.
9.30, 23.05 Гісторыя хвароб.
10.00, 23.35 Харчовыя дабаўкі.
10.55, 0.30 Як Вы сябе адчуваеце?
11.25, 1.00 Дзіця нарадзілася.
11.55, 1.30 Аздараўленчы турызм.
12.25 Лабараторыя.
12.55 Доктар клоўн.
13.25 Пабочныя дзеянні.
13.55 Рэцэпты на розных мовах.
14.25 Хірургія.
14.55 Я расту.
15.25 Магчымасці чалавечага цела.
16.20 Найноўшыя дасягненні ў медыцыне.
16.50 Элемент здароўя.
17.20 Тэрапія.
17.50 Жаночае здароўе.
18.20 Дыета.
4.30 Рэцэпты на розных мовах.

### ТДК

6.00, 7.50, 13.50, 16.55, 17.50, 18.50, 21.50 Парады ТДК.
6.25, 9.00, 15.00 Усё лепшае для вас.
7.25, 12.00, 18.00, 21.00, 5.00 Ваш доктар.
8.00 Добрай раніцы, каханая!
10.00, 17.00 Красуня.
11.00, 16.00, 20.00, 0.30 Ваш асабісты псіхолаг.
13.00, 2.10 Нашы дзеці.
14.00, 1.20 Твой дом.
19.00, 22.50, 4.00 Люстэрка жыцця.
22.00, 23.40 Сексуальная рэвалюцыя.
3.00 Маст. фільм.

---

Анталогія беларускага верша пра каханне
*Песняй вясны лебядзінаю...*
*Вядучы Алесь Каско*

## ТАЯ САМАЯ ЗОРКА

У беларускай лірыцы кахання, бадай, няма больш вядомага верша, чым славуты багдановічаўскі «Раманс», хоць на фоне сучасных павеваў у паэзіі ён для кагосьці выглядае «старамодным». Сёння адвечна-вечны матыў усё часцей набывае грубавата-іранічныя адценні, сутнасць якіх, паводле крытыкаў, у пратэсце «супраць рамантычна-сентыментальных уздыхаў» ды «ўлюбёнасці» аўтараў у саміх сябе. Іншымі словамі — даеш рэвалюцыю!..

Згадайма, М. Багдановіч не ўзводзіў ні красу, ні яе стваральнікаў у нейкі абсалют, у яго нямала наконт гэтага іроніі: дно прыгожага гнязда ластаўка лепіць з гразі (у яго — з «бруду»), а «пекна спяваюць» нават жабы. Затое чысціню пачуцця, тым больш інтымнага, паэт сцвярджаў і адстойваў. Гэтая чысціня і ў аснове «Раманса»: каханне, якое, як вядома, не бывае без смутку наогул, змянілася прымусовым расстаннем, аднак не памерла, яно ўвасобілася ў яркі сімвалічны вобраз — у нязгасную Зорку. Празмернай чуллівасці (той самай сентыментальнасці) тут няма, як няма яе, дарэчы, і ў цыклах «Каханне і смерць» або «Эрас», матывы якіх вельмі далікатныя.

І яшчэ дзве заўвагі адносна «Раманса». Нярэдка верш друкуюць без эпіграфа, што зусім не апраўдана: М. Багдановіч, паэт высокай культуры, не дазваляў сабе «прысвойваць» і ценю чужой думкі, таму і прывёў радкі Сюлі-Прудома, якія далі штуршок для стварэння ўласнага шэдэўра. Нарэшце, не лішне нагадаць: даследчыкі даўно ўжо і небеспадстаўна сцвярджаюць, што музыка да гэтага раманса (песні «Зорка Венера») мае канкрэтнага аўтара. Яна належыць заходнебеларускаму грамадскаму і культурнаму дзеячу Сымону Рак-Міхайлоўскаму і лічыцца народнай толькі ў сілу сваёй папулярнасці.

**МАКСІМ БАГДАНОВІЧ**

**Раманс**

*Quand luira cette etoile, un jour,*
*La plus belle et la plus lointaine,*
*Dites-lui qu 'elle eut mon amour,*
*O derniers de la race humaine.*
*Sully-Prudhomme**

*Зорка Венера ўзышла над зямлёю,*
*Светлыя згадкі з сабой прывяла...*
*Помніш, калі я спаткаўся з табою,*
*Зорка Венера ўзышла.*
*З гэтай пары я пачаў углядацца*
*Ў неба начное і зорку шукаў.*
*Ціхім каханнем к табе разгарацца*
*З гэтай пары я пачаў.*
*Але расстацца нам час наступае;*
*Пэўна, ўжо доля такая у нас.*
*Моцна кахаў я цябе, дарагая,*
*Але расстацца нам час.*
*Буду ў далёкім краю я нудзіцца,*
*Ў сэрцы любоў затаіўшы сваю;*
*Кожную ночку на зорку дзівіцца*
*Буду ў далёкім краю.*
*Глянь іншы раз на яе, — у расстанні*
*Там з ёй зліём мы пагляды свае...*
*Каб хоць на міг уваскрэсла каханне,*
*Глянь іншы раз на яе...*

** Калі заблішчыць гэтая зорка,*
*Самая цудоўная, самая далёкая,*
*Скажыце ёй, што ёй належыць маё каханне,*
*О апошнія з чалавечага роду.*
*Сюлі-Прудом **(фр.)***

**Продажа кур-несушек Доминант 6-16 недель (12 пород).**
Цена от 40 000 рублей.
**Продажа цыплят-бройлеров.** Цена 9 000 рублей.
Птицекомплекс Шинковцы, Гродненский р-н.
Тел.: 8 (0152) 73 03 55, 77 17 85, http://kurochka.by.
УНП 590619043

■ Ні хваста, ні лускі!

# «ЮШКІ І ПЕСЕНЬ ХОПІЦЬ УСІМ!»

**У гэтым запэўніў старшыня аргкамітэта IV Міжнароднага музычна-спартыўнага свята «Вялікая бард-рыбалка», уласны карэспандэнт БелТА па Магілёўскай вобласці Сяргей Кулягін падчас прэс-канферэнцыі, прысвечанай правядзенню мерапрыемства. Сёлета яно пройдзе 25—28 ліпеня ў вёсцы Грудзічына Быхаўскага раёна.**



Фота БЕЛТА.

Пачатак праекта «Вялікая бард-рыбалка» быў пакладзены ў 2010 годзе, і за гэты час ён ператварыўся ў яркую і неардынарную культурную падзею, пра якую ведаюць не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Калі першая бард-рыбалка сабрала каля 500 чалавек, то ў 2012 годзе гэтая лічба павялічылася ўтрая. Да «традыцыйных» удзельнікаў і гасцей «Вялікай бард-рыбалкі» (з Расіі, Беларусі і Украіны) сёлета далучыліся Латвія, Эстонія, Малдова, Польшча, Германія.

— Свята прыцягвае да сябе шмат гасцей, бо яно па-свойму ўнікальнае, — адзначыў Сяргей Кулягін. — Больш ні на адным фестывалі няма такога гарманічнага спалучэння музыкі, спорту і здаровага, актыўнага ладу жыцця.

Аснову праграмы «Вялікай бард-рыбалкі-2013» традыцыйна складуць конкурс аўтарскай песні, рыбалоўны турнір, трэці адкрыты чэмпіянат Беларусі па гатаванні юшкі «Чыгірынская юшка!», канцэрты аўтарскай песні, інструментальнай музыкі і класічнай гітары. Апроч гэтага, арганізатары падрыхтавалі некалькі новых праектаў. Адзін з іх — моладзевая бард-акадэмія ў фармаце профільнага палатачнага лагера каля вёскі Грудзічына, якая адкрыецца напярэдадні свята. Беларускія гітарысты і госці з блізкага замежжа сёлета рыхтуюць для бард-рыбалкі новы праект «І не толькі джаз...». Пашырыць фармат і традыцыйны Кірмаш здароўя, падчас якога ўпершыню адбудзецца свята лазні «Лазенькі-2013». Спартыўны і аздараўленчы складнікі свята працягне першы адкрыты турнір сярод партнёраў па пляжным валейболе.

Адной з галоўных падзей бард-рыбалкі стане гасцявы канцэрт з удзелам Аляксея Івашчанкі (Масква), Галіны і Барыса Вайханскіх (Мінск), Уладзіміра Дацэнкі (Кіеў), Віктара Шалкевіча (Гродна) і іншых вядомых аўтараў і выканаўцаў.

У спецыяльнай праграме запланаваны водныя экскурсіі на востраў кахання, катанне на конях, «горад майстроў», майстар-класы і канцэртна-забаўляльныя мерапрыемствы. Кульмінацыяй «Вялікай бард-рыбалкі-2013» стане гатаванне самай вялікай юшкі ў свеце. Плануецца зварыць больш за 3,5 тысячы літраў юшкі, для якой спатрэбіцца амаль тона рыбы. Для рэгістрацыі рэкорда на свята будзе запрошаны прадстаўнік Кнігі рэкордаў Гінеса.

Месца правядзення «Вялікай бард-рыбалкі» выбрана нездарма.

— Мы не маглі не скарыстацца прыроднымі магчымасцямі Дняпра і Чыгірынскага вадасховішча, — патлумачыў старшыня Быхаўскага райвыканкама, сустаршыня аргкамітэта свята Дзмітрый Калееў. — Акрамя таго, наш раён з'яўляецца лідарам па колькасці аграэкасядзіб у Магілёўскай вобласці, у нас іх налічваецца 22. Мы імкнёмся развіваць гэтую галіну.

— Фестываль ужо чатыры гады дае штуршок для развіцця ўнікальнай мясцовасці вёскі Грудзічына і Чыгірынскага вадасховішча, — заявіў намеснік генеральнага дырэктара прадпрыемства «Магатэкс» — генеральнага партнёра «Вялікай бард-рыбалкі-2013» Міхаіл Свірэпа. — Таму мы з радасцю яго падтрымліваем.

Удзельнічаць у бард-рыбалцы могуць усе ахвотныя. Для гэтага дастаткова не пазней за 25 ліпеня даслаць у аргкамітэт або размясціць на афіцыйным сайце мерапрыемства (bard-rybalka.by) заяўку ў вольнай форме з указаннем прозвішча, імя, імя па бацьку і месца жыхарства. Можна зарэгістравацца і ў дзень прыезду — на КПП свята.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК**



Фота слова. Яўгена Лясецкага

*Яны ў букетах пышных не былі,*
*Але іх сціплы лёс усім зайздросны.*
*Бо кветкі паміраюць на зямлі,*
*А дзьмухаўцы —*
*заўжды ляцяць ў нябёсы.*

*Акно у ноч нячутна расчыні —*
*Убачыш: дзесьці там,*
*за чорным дахам,*
*Мігціць у недасяжнай вышыні*
*Сузор'е дзьмухаўцоў*
*над Млечным шляхам.*

*Няхай мяне напрыканцы гадоў*
*Таксама панясе бяздомнік вецер —*
*Каб толькі з высі бачыць край дзядоў*
*І тую, што бліжэй за ўсіх на свеце.*

■ Медыяпрастора

## «КІНАМЕТРАЖ»

МИР

| | | | |
|---|---|---|---|
| Брэст | 106.6 FM | Бабруйск | 103.6 FM |
| Віцебск | 101.8 FM | Баранавічы | 98.4 FM |
| Мінск | 107.1 FM | Салігорск | 104.3 FM |
| Гродна | 104.2 FM | Пінск | 103.2 FM |
| Магілёў | 107.8 FM | | |

Усе фільмы ў 3D. Дзве вялікія прэм'еры — «Вялікі Гэтсбі» і «Стартрэк: Адплата» — выйшлі на шырокі экран трохмернымі. І калі для фантастычнага кіно з касмічнымі баталіямі гэта лагічна, то экранізацыя рамана пра страчанае пакаленне амерыканскага класіка ў 3D — гэта нешта новае. І падабаецца далёка не ўсім. Няўжо нельга без гэтага паказаць раскошу і разгул па-фіцджэральдаўску з шампанскім і сукенкамі з шоўку колеру апала? Аднак імя рэжысёра гаворыць пра многае. Баз Лурман не рэтраград і з класікай не далікатнічае. Варта хаця б узгадаць яго «Рамэа + Джульета» і «Мулен Руж» і яшчэ да прагляду падрыхтаваць сябе да двухгадзіннага кліпа. Трохмернага. Да таго ж там Леанарда Ды Капрыа, які ўжо ўсім даказаў, што ён не акцёр аднаго «Тытаніка». Для тых жа, хто не з'яўляецца прыхільнікам 3D, стваральнікі літасціва прыхавалі 2D-версію.

Кожную пятніцу ў 14:45 у праграме «Кінаметраж» на радыё «Мір» мы прыглядаемся да навінак кінаіндустрыі і падводзім вынікі мінулых выхадных. Не прамінем і сусветныя здымачныя пляцоўкі, каб даведацца, чым жа нас неўзабаве здзівяць вядомыя рэжысёры і ў каго пераўвасобіліся зоркі першай велічыні.

Будзьце ў курсе падзей і глядзіце добрае кіно!

## СЛУХАЙ ЛЮБІМАЕ!

Сталіца 105.1

| | | | |
|---|---|---|---|
| МІНСК | 72,89 і 105,1 МГц | Смятанічы | 70,28 |
| Мядзел | 66,86 | Брагін | 69,11 |
| Салігорск | 68,57 | Жлобін | 71,81 |
| Беразіно | 67,07 | Зашчэб'е | 73,19 |
| Капыль | 73,22 | ГРОДНА | 68,90 МГц |
| БРЭСТ | 72,47 МГц | Геранёны | 69,26 |
| Ракітніца | 72,47 | Смаргонь | 66,38 |
| Пінск | 67,88 | Свіслач | 68,72 |
| Баранавічы | 71,18 | Любча | 70,85 |
| Драгічын | 69,80 | Масты | 70,76 |
| ВІЦЕБСК | 72,26 МГц | МАГІЛЁЎ | 71,18 МГц |
| Ушачы | 70,94 | Палыковічы | 71,18 |
| Браслаў | 73,49 | Бабруйск | 73,01 |
| Орша | 73,82 | Касцюковічы | 69,38 |
| | | Асіповічы | 72,47 |
| ГОМЕЛЬ | 66,20 МГц | Мсціслаў | 73,73 |

Сёння мы працягваем знаёмства з праектамі сезона 2012-2013 гг. на радыёстанцыі «Сталіца».

Кожны будны дзень аўтар і вядучая рубрыкі «ЛаЛаБай» Іна Дарашкевіч запрашае вас паслухаць казку і песні на ноч. «ЛаЛаБай» — калыханка на добры сон, каб лепш думалася і ўспрымалася мудрасць народаў Свету. За час праекта ў тых, хто не спіць глыбокай ноччу (нехта гэты час называе «раннім ранкам»), ёсць магчымасць узгадаць літаратурны жанр, які разлічаны на аўдыторыю без узросту. Вы зможаце пачуць дзясяткі моў — праз песню.

Адным словам: «ЛаЛаБай» — слухай нас — адпачывай».

Ці ёсць сярод нас людзі, якія не хочуць пабываць у розных краінах і пазнаёміцца з гісторыяй, прыродай, культурай, традыцыямі і славутасцямі іншых народаў? Ці ёсць сярод нас тыя, каму ўсё роўна, што адбываецца ў іх доме — на планеце Зямля? Падарожжа — гэта выдатна! Давайце паспрабуем разам пазнаёміцца з асаблівасцямі і разнастайнасцю цікавых куточкаў Зямлі, з загадкавым і дзівосным светам раслін і жывёл. Кожны аўторак і чацвер у рубрыцы Нэлі Шэўчык «Цікавая планета» — актуальная і пазнавальная інфармацыя для тых, хто любіць вандраваць і здольны ацаніць прыгажосць нашай планеты, а таксама для тых, хто збіраецца далучыцца да падарожжа.

**МЕЛЬНИЦЫ 220в ИНКУБАТОРЫ, КОРМОРЕЗКИ, КОПТИЛЬНИ, СЕПАРАТОРЫ, МАСЛОБОЙКИ, ДОЙКИ, УМЫВАЛЬНИКИ, ТЕПЛИЦЫ, КОРМОЗАПАРНИКИ**
и прочее.
**Гарантия и бесплатная доставка!**
мтс 8-029-211-68-78
вел 8-029-308-68-78
ИП Рачицкий С.Н. УНП 190751912

# «МЫ ЗАЎСЁДЫ ЎЛІЧВАЕМ ІНТАРЭСЫ КРАІНЫ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Зараз мы працягваем крэдытную падтрымку айчынных вытворцаў, аддаючы прыярытэт інавацыйным праектам з высокімі навукаёмістымі і рэсурсазберагальнымі тэхналогіямі, рэалізацыя якіх дасць магчымасць забяспечваць выпуск канкурэнтаздольнай прадукцыі высокай якасці, экспартнай і імпартазамяшчальнай накіраванасці. Фінансаванне праектаў, якія прадугледжваюць імпарт абсталявання, тэхнікі, іншых тавараў і паслуг ажыццяўляецца з прыцягненнем звязаных крэдытных рэсурсаў замежных банкаў.

Хачу падкрэсліць, што і сёлета плануецца рэалізаваць 240 інвестыцыйных праектаў з падтрымкай нашага банка. Сярод іх такія буйныя, як мадэрнізацыя дзейнай лініі па вытворчасці паліраванага шкла і арганізацыя вытворчасцяў па прамысловай перапрацоўцы шкла на прадпрыемстве «Гомельшкло», абнаўленне рухомага саставу Беларускай чыгункі і пасажырскага транспарту «Мінсктранс», будаўніцтва драбнасортна-драцянога стана на Беларускім металургічным заводзе.

Я звяртаю ўвагу на тое, што асноўнымі крытэрыямі пры прыняцці рашэнняў аб удзеле банка ў крэдытаванні інвестыцыйных праектаў з'яўляецца іх эфектыўнасць, а таксама, натуральна, перспектыва пагашэння крэдытаў і працэнтаў за карыстанне імі. Пры адборы праектаў для крэдытавання банк улічвае не толькі важнасць іх для прадпрыемства, але і ў цэлым для краіны з улікам задач, пастаўленых кіраўніком дзяржавы і ўрадам. Дзеля апаратыўнага прыняцця рашэнняў па крэдытаванні прадпрыемстваў прадстаўнік банка прымае ўдзел у штотыднёвых пасяджэннях міжведамаснай камісіі па мадэрнізацыі эканомікі краіны, дзе якраз і разглядаюцца праблемныя пытанні, звязаныя з ажыццяўленнем буйных інвестыцыйных праектаў.

**— Сяргей Паўлавіч, як змянілася работа Беларусбанка па падтрымцы жыллёвага будаўніцтва ў сувязі з уступленнем у сілу Указа № 13, якім было ўпарадкавана і ўдакладнена яго крэдытаванне?**

— Беларусбанк працягвае выдачу льготных крэдытаў на рэалізацыю дзяржаўнай жыллёвай праграмы. Згодна з гэтым дакументам, крэдытаванне жыллёвага будаўніцтва ажыццяўляецца ў межах аб'ёмаў, якія зацвярджаюцца Законам аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год. Пры гэтым Указам № 13 на банк ускладаецца абавязак па ажыццяўленні кантролю за накіраваннем ільготных крэдытных рэсурсаў на аб'екты, што будуюцца, строга ў адпаведнасці з пералікамі шматкватэрных і індывідуальных жылых дамоў, узвядзенне якіх у гэтым годзе ажыццяўляецца з выкарыстаннем дзяржпадтрымкі. Я падкрэслю, што ў 2013 годзе аб'ёмы крэдытных рэсурсаў на фінансаванне жыллёвага будаўніцтва прадугледжаны ў памеры больш за 9 трлн рублёў. У параўнанні з леташнім паказчык павялічаны больш чым на 2 трлн.

**«Банк надае сур'ёзную ўвагу рэалізацыі сацыяльна значных праектаў, асноўная мэта якіх — падтрымаць і дапамагчы менавіта канкрэтным людзям і арганізацыям.**

Пры гэтым нормы Указа накіраваны і на ўпарадкаванне катэгорый грамадзян, якія ажыццяўляюць будаўніцтва жылля з прыцягненнем дзяржпадтрымкі. Адбылося ўзмацненне адраснасці падтрымкі і стварэнне перадумоў для пераходу да іншых механізмаў фінансавання жыллёвага будаўніцтва: да сістэмы жыллёвых будаўнічых зберажэнняў, стварэння дзяржаўнага жыллёвага фонду для прадастаўлення яго ў наём, дзяржаўнага заказу. Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь сёлета 8 мая падпісаны і Указ № 215, які рэгламентуе парадак і ўмовы фінансавання будаўніцтва жылля па прынцыпе дзяржаўнага заказу. Сутнасць у тым, што на этапе будаўніцтва грамадзяне выключаны з інвестыцыйнага працэсу. Будаўніцтва жылля будзе ажыццяўляцца адзінымі дзяржаўнымі заказчыкамі (упраўленнямі капітальнага будаўніцтва), а таксама іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі, а затым пераафармляцца на грамадзян, якія ўключаны ў спісы на атрыманне льготных крэдытаў і заключылі крэдытныя дагаворы.

**— Як банк стымулюе павелічэнне долі безнаяўных плацяжоў, ці дастаткова мае банкаматаў, інфакіёскаў, асабліва ў невялікіх гарадах і вёсках?**

— Гэта таксама адна з нашых асноўных задач, таму банк на працягу многіх гадоў праводзіць актыўную работу па павелічэнні долі безнаяўных плацяжоў. Тут надаецца ўвага як развіццю інфраструктуры абслугоўвання трымальнікаў картак, так і пашырэнню спектру паслуг. Сёння Беларусбанк мае больш за 1,1 тыс. банкаматаў і 2,1 тыс. інфакіёскаў, дзейнічае каля 2 тыс. пунктаў прыёму камунальных плацяжоў і 2 тыс. пунктаў выдачы наяўных грошай. Больш за 21 тыс. арганізацый гандлю і сэрвісу — крам, гандлёвых цэнтраў, кавярняў, рэстаранаў, устаноў аховы здароўя і г.д. абслугоўваюць трымальнікаў картак на падставе дагавораў, заключаных з Беларусбанкам. Мы развіваем інфраструктуру абслугоўвання трымальнікаў картак як у буйных гарадах, так і ў сельскіх населеных пунктах. Трымальнікі нашых картак, што жывуць у невялікіх гарадах і вёсках, могуць скарыстацца і інфакіёскамі, і банкаматамі, а таксама разлічыцца за тавары і паслугі ў крамах, з якімі банк заключыў дагаворы па абслугоўванні. Акрамя гэтага, развіццё сэрвісаў дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання — SMS-банкінг, М-банкінг, інтэрнэт-банкінг — спрыяе таму, што сёння ў трымальніка карткі банка, дзе б ён ні жыў, практычна няма неабходнасці наведваць установы банка. Такія сэрвісы дазваляюць ажыццявіць самы шырокі спектр фінансавых аперацый з дапамогай мабільных тэлефонаў або інтэрнэту. А ў мэтах прыцягнення кліентаў да правядзення паўсядзённых безнаяўных плацяжоў мы развіваем праграмы лаяльнасці з арганізацыямі гандлю і сэрвісу. Зараз больш за 600 такіх арганізацый па ўсёй рэспубліцы прадастаўляюць трымальнікам картак банка зніжкі на тавары і паслугі. На стымуляванне безнаяўных плацяжоў таксама накіраваны рэкламныя гульні і акцыі. Трымальнікі картак актыўна ўдзельнічаюць у іх пры правядзенні безнаяўных плацяжоў, многія выйгравалі грашовыя прызы і паездкі ў розныя краіны свету на культурныя і спартыўныя мерапрыемствы.

**— Якія новыя прадукты і паслугі рыхтуе банк сваім кліентам у бліжэйшы час?**

— Для бізнесу ў нас ёсць прапанова па падборы аптымальнага па кошце пакета паслуг за штомесячную плату. Пра ўсе пакеты паслуг падрабязна можна даведацца на нашым абноўленым сайце. Падкрэслю яшчэ, што паслугі пастаянна ўдасканальваюцца, зыходзячы менавіта з патрэб кліентаў. Зараз мы распрацоўваем спецыяльны пакет для індывідуальных прадпрымальнікаў і мікраарганізацый. Для прадпрыемстваў, занятых у сферы вытворчасці, аказання транспартных паслуг і іншых, зацікаўленых у ажыццяўленні плацяжоў у замежнай валюце, прапрацоўваецца пытанне пашырэння лінейкі існуючых пакетаў паслуг за кошт напаўняльнасці іх аперацыямі ў замежнай валюце, міжнароднымі і ўнутрырэспубліканскімі пераводамі. Удасканаленне карткавых прадуктаў для карпаратыўных кліентаў ідзе праз зарплатныя праекты, дзе прапануюцца пластыкавыя карткі з індывідуальным дызайнам.

Адной з новых паслуг з'яўляецца і рэалізацыя сумеснага праекта з «Белдзяржстрахам» — заключэнне банкам з юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі ад імя страхавой арганізацыі дагавораў добраахвотнага страхавання медыцынскіх расходаў. Гэты праект прадастаўляе кліентам магчымасць атрымліваць комплекснае абслугоўванне і карыстацца фінансава-банкаўскімі паслугамі ў адным пункце на выгадных умовах.

**«Я звяртаю ўвагу на тое, што пры адборы праектаў для крэдытавання банк улічвае не толькі важнасць іх для прадпрыемства, але і ў цэлым для краіны з улікам задач, пастаўленых кіраўніком дзяржавы і ўрадам».**

Я лічу, што вялікай канкурэнтнай перавагай банка ў абслугоўванні кліентаў з'яўляецца наш шматгадовы вопыт дзейнасці, высокі прафесійны ўзровень спецыялістаў, здольных аказаць кансультацыйную падтрымку ў працэсе арганізацыі абслугоўвання кліента, шырокая філіяльная сетка па ўсёй краіне, магчымасць забеспячэння як віртуальнага, так і візуальнага кантакту пры рабоце з кліентам.

**— Жыццё патрабуе ўсё большай фінансавай адукаванасці насельніцтва. Што ў гэтым кірунку робіцца банкам?**

— Сапраўды, імклівае развіццё банкаўскіх паслуг робіць фінансавую адукацыю неабходнай для ўсіх спажыўцоў. Урадам і Нацыянальным банкам краіны зацверджаны план сумесных дзеянняў органаў кіравання і ўдзельнікаў фінансавага рынку па павышэнні фінансавай адукаванасці насельніцтва на 2013 — 2018 гады, таму Беларусбанк таксама выступае актыўным удзельнікам гэтага працэсу. Для ўдасканалення работы з фізічнымі асобамі сёлета плануецца арганізаваць віртуальную «Школу па фінансавай адукацыі» з выкарыстаннем інтэрнэт-рэсурсаў банка, а таксама распрацаваць тэматычныя праграмы для школ і дашкольных устаноў, гульнявыя, адукацыйныя праграмы, фільмы, тэсты для павышэння фінансавай адукаванасці. Раю карыстацца нашым сайтам, дзе ўжо даступны раздзел «Азбука фінансавай адукаванасці», які дазваляе азнаёміцца з асноўнымі фінансавымі тэрмінамі, правіламі грашовых узаемаадносін і іншым. Вось, напрыклад, у раздзеле «Крэдытаванне насельніцтва» можна даведацца, што такое крэдыт, хто можа стаць яго атрымальнікам, хто паручыцелем, каму даецца льготны крэдыт, якія ўмовы асобных відаў крэдытавання, якія патрабаванні да пагашэння крэдытаў і многае іншае. Карыстаючыся крэдытным канструктарам, кліенты могуць фарміраваць разліковыя графікі плацяжоў па крэдытах. Усё больш папулярным спосабам камунікацыі становіцца і паслуга «анлайн-кансультант».

**— Ваш банк традыцыйна праводзіць вялікую работу па падтрымцы тых, каму асабліва цяжка ў няпросты час — дзяцей і таленавітай моладзі, ветэранаў і шматдзетных сем'яў. Якія найбольш значныя сацыяльныя праекты рэалізуюцца цяпер?**

— Банк надае сур'ёзную ўвагу — я гэта падкрэслю — рэалізацыі сацыяльна значных праектаў, асноўная мэта якіх — падтрымаць і дапамагчы менавіта канкрэтным людзям і арганізацыям. І тут мы дзейнічаем па некалькіх кірунках.

Першае — будаўніцтва катэджаў для дзіцячых дамоў сямейнага тыпу. Такія аб'екты — а ўсяго іх 12 — узведзены ўжо ва ўсіх абласцях, яшчэ два сёлета з'явяцца ў Ганцавіцкім і Слаўгарадскім раёнах. Пасля ўводу ў эксплуатацыю гэтыя дамы перадаюцца на баланс мясцовым выканкамам, але наша дапамога на гэтым не заканчваецца: грамадскія арганізацыі банка («Белая Русь», БРСМ, аб'яднаная прафсаюзная арганізацыя банка, Беларускі саюз жанчын) працягваюць кантактаваць з сем'ямі, набываюць для іх бытавую тэхніку, праводзяць суботнікі і дораць дзецям падарункі.

Другі напрамак — падтрымка медыцынскіх устаноў краіны па ўкараненні сучасных метадаў лячэння. Напрыклад, выдзелены сродкі Гомельскаму рэспубліканскаму навукова-практычнаму цэнтру радыяцыйнай медыцыны і экалогіі на набыццё дыягнастычнага абсталявання. Дзеці і моладзь — будучыня нашай краіны. Установы адукацыі, якія знаходзяцца пад нашым патранажам — а іх больш за 70 — таксама адчуваюць нашу падтрымку. Тут асаблівая ўвага — дзецям-інвалідам і сіротам.

Зноў падкрэслю, што важная роля ў рэалізацыі сацыяльных праектаў адводзіцца грамадскім арганізацыям банка. Імі рэалізуюцца розныя праекты: «90 добрых спраў», «Мы — дзецям», «У Новы год з добрым сэрцам!», «Калядныя цуды», «Мы побач», «Нашы дзеці», «Мы памятаем пра вас, ветэраны!» і г.д., якія накіраваны на падтрымку тых, хто ў гэтым мае патрэбу. Заўважана, што дзейнасць грамадскіх арганізацый у гэтым напрамку яшчэ больш аб'ядноўвае наш вялікі калектыў і ўмацоўвае карпаратыўны дух.

Гэтая работа праводзіцца пастаянна і ў спісе бліжэйшых спраў правядзенне акцыі да Дня абароны дзяцей. Гэтым разам аб'ектамі ўвагі стануць дзіцячыя дашкольныя ўстановы, якім будуць перададзены цацкі, кнігі, развіваючыя гульні.

**Пятро РАМАНЧУК.**

# ЛЁН НА ДЗВЕ ДЗЯРЖАВЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)




Толькі ад перамены формы ўласнасці працаваць і выжываць лягчэй не стала. У цэхах камбіната паступова ідзе замена старога абсталявання на сучаснае, але большасць вытворчасцяў пакуль працуюць на савецкіх станках. Выканаўчы дырэктар мануфактуры Ірына Каленава прывяла толькі адзін прыклад: за год кошт электраэнергіі вырас амаль у два разы. «Куды мы толькі не пісалі, — расказвала Ірына Юр'еўна. — Нам ніхто не адказаў, акрамя пракуратуры, якая пазначыла, што ўсё законна, не варта хвалявацца, лепш спраўна аплачваць рахункі».

Дырэктар дэпартамента сельскай гаспадаркі Кастрамской вобласці спадар Чарноў адзначыў, што рэгіён зараз сее 2 тысячы гектараў лёну. Для параўнання: у савецкія часы было 52 тысячы гектараў. Ступень зношанасці сельгастэхнікі, якая працуе на льняным полі, складае прыкладна 70 працэнтаў. У такіх умовах гаварыць пра якасць прадукцыі, рэнтабельнасць галіны асабліва не даводзіцца. Гаворка ідзе аб выжыванні. І выйсцем бачыцца дзяржаўная падтрымка, а таксама інтэграцыя дзвюх дзяржаў. У Беларусі ёсць сучасная тэхніка — трэба наладзіць пастаўкі машын і агрэгатаў на выгадных для вытворцаў умовах. Пра гэта не раз давядзецца пачуць ад расійскіх ільнаводаў. Яшчэ ў Кастраме гаварылі пра стасункі з Оршай. З аршанскімі калегамі кастрамічы абменьваюцца інфармацыяй рэгулярна, ведаюць рынкі збыту нашых тэкстыльшчыкаў. Напрыклад, аўтар гэтых радкоў упершыню ў Кастраме пачула, што беларуская армія спіць... на лёне. На чым спіць і ў што апранаецца расійская армія, скажу крыху пазней.

Праблема тэхнічнага аснашчэння галіны, на думку спецыялістаў, — адна з галоўных у справе прагрэсу льнаводства. Даволі рэзка выказаўся на гэтую тэму дырэктар Усерасійскага навукова-даследчага інстытута механізацыі льнаводства Рассельгасакадэміі Міхаіл Кавалёў. Вучоны сказаў, што да сённяшняга стану галіны прывяло рабаванне асноўных фондаў вытворчасці ў выніку прыватызацыі і шокавай тэрапіі. Ілюстрацыю да гэтых слоў мы ўбачылі на Гаўрылаў-Ямскім прадпрыемстве Яраслаўскай вобласці. Некалі горадаўтваральнае прадпрыемства, дзе было занята 7 тысяч працаўнікоў райцэнтра, уяўляе сабой сумную карціну. У адным з цэхаў, які працуе, занята каля сотні жанчын. Застаўся, па сутнасці, швейны цэх, які выпускае пасцельную бялізну, шторы з розных тканін. Самае цікавае давялося пачуць у канцы, між іншым. Аказваецца, гадоў з дзясятак таму прадпрыемства купіў расійскі алігарх Алег Дзерыпаска. З тае пары ён носа сюды не паказваў і сродкаў, як не цяжка здагадацца, не ўкладваў. Навошта алюмініеваму каралю занядбалы льнозаводзік, гісторыя замоўчвае. Але жанчыны не здаюцца, працуюць. Энергічны начальнік цэха рэгулярна закупляе сыравіну, з яе шыюць вырабы, забяспечваючы сабе зарплату.

Праўда, цэх па вытворчасці льняного алею, які ўваходзіць у склад Гаўрылаў-Ямскага льнозавода, сёння — сучаснае прадпрыемства з імпартным аснашчэннем, якое паспяхова працуе. У рамках праграмы «Рэканструкцыя цэхаў глыбокай перапрацоўкі льну і яго вытворных» на гэты цэх выдаткаваны сродкі з абласнога і федэральнага бюджэтаў. Вынік не прымусіў сябе чакаць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**(Заканчэнне будзе.)**

*Мінск — Масква — Цвер — Яраслаўль — Кастрама — Волагда.*

Даты | Падзеі | Людзі

**СУСВЕТНЫ ДЗЕНЬ БЕЗ ТЫТУНЮ.** ***Абвешчаны ў 1987 годзе па ініцыятыве Сусветнай арганізацыі аховы здароўя з мэтай прыцягнуць увагу да праблемы распаўсюджвання ў свеце курэння.***

**1746** год — нарадзіўся (горад Слуцк) Антон Лойка, беларускі танцоўшчык і балетмайстар. З 1756 года вучыўся ў Слуцкай балетнай школе Г.Ф. Радзівіла і адначасова быў салістам мясцовай трупы. Працаваў педагогам балетнай школы і балетмайстрам у прыдворным тэатры Радзівілаў у Нясвіжы. У 1780 годзе быў пасланы К.С. Радзівілам у Італію і Аўстрыю для азнаямлення з іх балетным мастацтвам. Пасля вяртання ў Нясвіж стаў вядучым балетмайстрам у тэатры. Падрыхтаваў пастаноўкі балетаў «Арфей у пекле», «Турэцкі балет», «Пігмаліён» і іншых. У Нясвіжы працаваў са сваёй дачкой-балярынай да роспуску балета ў 1790 годзе. Дата смерці невядомая.

**1859** год — пачаў адлік часу галоўны гадзіннік Лондана і Англіі — Біг Бэн, сканструяваны Эдмундам Бэкетам. Строга кажучы, Біг Бэн — гэта не гадзіннік на будынку англійскага парламента ў Вестмінстары і не вежа, як прынята лічыць, а адзін з пяці званоў вялікай гадзіннікавай вежы вагой у 13 тон. Існуе



дзве версіі паходжання назвы Біг Бэн: гэта альбо імя старшыні парламенцкай камісіі Бенджамена Хола, які ў той час кіраваў будаўніцтвам, альбо імя славутага баксёра Бенджамена Каўнта. Бой Біг Бэна лічыцца сімвалам Вялікабрытаніі, яго можна пачуць як сігнал дакладнага часу па радыёсетцы «Бі-бі-сі».

**1948** год — нарадзілася Святлана Аляксандраўна Алексіевіч, беларуская пісьменніца. Аўтар кніг «У вайны не жаночы твар», «Апошнія сведкі», «Цынкавыя хлопчыкі», «Чарнобыльская малітва» і іншых. Паводле яе сцэнарыяў пастаўлены спектаклі і дакументальныя фільмы. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, прэміі Ленінскага камсамола Беларусі.

Было сказана

**Люба ТАРАСЮК (1953-2006), паэтэса, літаратуразнавец:**

*І ў тым, каб доляй*
*годнай даражыць,*
*Не выглядаючы выгодаў*
*лепшых...*
*Перад няўмольнасцю*
*зямлёю легчы —*
*Ёсць толькі права*
*чалавекам быць.*


Уважаемые акционеры

**ОАО «Промэлектромонтаж»!**

**13 июня 2013 г. в 9 часов 30 минут**
**СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об объявлении закрытой подписки на акции ОАО «Промэлектромонтаж» дополнительного выпуска.

Местонахождение ОАО «Промэлектромонтаж»: **г. Минск, ул. Аранская, 13.**

Место проведения собрания: **г. Минск, пр-т Победителей, 19 (комната переговоров гостиницы «Юбилейная»).**

Время начала регистрации участников: в день проведения собрания с 09 часов 00 минут по месту проведения. Регистрация акционеров проводится по паспорту, а представителей акционеров – по паспорту и доверенности. Список акционеров для регистрации участников собрания составлен по данным реестра акционеров **на 28 мая 2013 г.** С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни **с 31.05.2013 г. по 12.06.2013 г. (с 9.00 до 17.00)** по месту нахождения Общества, а в день проведения собрания – по месту проведения собрания.

**Совет директоров ОАО «Промэлектромонтаж»**

УНП 100088916



**Наблюдательный совет ОАО «Світанак» г. Жодино**
**сообщает, что с июля 2013 г.**
**будет производиться выплата дивидендов акционерам ОАО «Світанак» по итогам работы за 2 полугодие 2012 г.**
**Справки по телефону: 8 (017 75) 7 16 66.**

УНН 600038919



***Вниманию акционеров ОАО «Белсолод»***

**12 июня 2013 г. по адресу: г. Иваново, ул. Полевая, 32**
**состоится внеочередное общее собрание акционеров.**
**Начало работы собрания в 13.30.**
**Время регистрации участников собрания —**
**в день проведения собрания с 12.30 до 13.30.**

Участникам собрания иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — также доверенность или договор). С информацией (документами) при подготовке к проведению собрания можно ознакомиться с 05 июня в рабочие дни с 9.00 до 16.00.

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О передаче в собственность гражданам жилых домов.
2. О внесении изменений в решение общего годового собрания акционеров по вопросу «О направлениях использования чистой прибыли ОАО «Белсолод» на 2013 год».

УНП 200075434

**Наблюдательный совет.**



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона)**
**по поручению ОАО «Интеграл» (продавец)**
**проводит открытый аукцион по продаже**
**административно-хозяйственного здания,**
**об. пл. 149,3 кв.м, инвентарный номер 500/С-855,**
**расположенного по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 105, корп. 3.**

**Начальная цена с НДС – 4 800 000 000 бел. руб.**

Площадь земельного участка – 0,0386 га *(предоставлен продавцу на праве постоянного пользования с установленными ограничениями: охранная зона теплосети, пл. 0,0084 га; обеспечение доступа эксплуатационным организациям-владельцам инженерных коммуникаций для производства ремонтно-восстановительных работ, пл. 0,0386 га)*.

**Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в отделении № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

**Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.**

**Аукцион состоится 01.07.2013 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703, пом. 5. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 28.06.2013 до 17.00 по указанному адресу.**

**Тел.: +375 17 280 36 37; 8029 183 69 71.**


## СЁННЯ

| **Сонца** | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| **Мінск** | — 4.45 | 21.30 | 16.45 |
| **Віцебск** | — 4.27 | 21.27 | 17.00 |
| **Магілёў** | — 4.35 | 21.20 | 16.45 |
| **Гомель** | — 4.41 | 21.08 | 16.27 |
| **Гродна** | — 5.02 | 21.44 | 16.42 |
| **Брэст** | — 5.12 | 21.36 | 16.24 |

### Месяц

***Апошняя квадра 21.58.***
***Месяц у сузор'і Рыб.***

### Імяніны

***Пр.*** *Аляксандры, Фаіны, Хрысціны, Юліі, Андрэя, Багдана, Давыда, Дзяніса, Паўла, Пятра.*
***К.*** *Ангеліны, Камілы, Марыі, Марыеты, Ксаверыя, Лявона, Фелікса.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.




## УСМІХНЕМСЯ

— Алё, дарагі, ты з чым бульбу будзеш на вячэру?

— З мясам.

— Як ведала... ужо купіла чыпсы з беконам.

**У мяне самы лепшы мужчына на свеце! Кожны дзень кажа, што любіць мяне, цалуе пры сустрэчы, дорыць такія мілыя падарункі! Адно дрэнна — у дзіцячы садок хадзіць не хоча...**

— Якую самую страшную фразу можа пачуць мужчына падчас занятку сексам?

— «Дарагі, я ўжо вярнулася!»

**Пазнаўшы ў чалавеку, які стаіць на палубе, акцёра Ды Капрыа, пасажыры ў паніцы сталі пакідаць круізнае судна.**



caricatura.ru

**ПРАДАЕЦЦА ўчастак** у с/т, 10 сотак, з фундаментам 5х6, 35 км ад МКАД. Тэл.: 8 029 761 50 10.


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**ЗАСНАВАЛЬНІКІ:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

**НАШ АДРАС**: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**ТЭЛЕФОНЫ**: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

**http://www.zviazda.by;**
**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by,
**(для зваротаў):** zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 24.600. Індэкс 63850. Зак. № 2301.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 30 мая 2013 года.




Міхаіл СУПРУНОВІЧ:

# «Мы не проста прадаём аўтамабіль. МЫ ПРАПАНУЕМ КОМПЛЕКС ПАСЛУГ І ПАДБІРАЕМ ВЫГАДНЫ ВАРЫЯНТ»

**Карэспандэнты «Звязды» гутараць з генеральным дырэктарам кіруючай кампаніі холдынга «БелГАЗаўтасэрвіс» Міхаілам Андрэевічам СУПРУНОВІЧАМ.**



**Прадукцыю аўтамабільнага гіганта на Волзе, які летась адзначыў 80-годдзе, людзі старэйшага пакалення памятаюць на прыкладзе наколькі сціплай, настолькі і легендарнай паўтаратонкі, што дапамагала каваць Перамогу. А таксама па шматлікіх мадэлях іншых «газонаў», якія на сваіх шырокіх плячах удзымалі эканоміку. Дарэчы, менавіта на паўтаратонцы вярнуўся з франтавых дарог бацька нашага суразмоўцы, Андрэй Іванавіч. «Гэта быў першы для мяне шафёр аўтамабіля ГАЗ, якога я ведаў, — расказвае Міхаіл Андрэевіч. — А мая маці, Яўгенія Данілаўна, была першым аўтаслесарам. Яна заўсёды дапамагала бацьку рамантаваць яго старэнькую палутарку».**

**Сёння «Газелі» і «Собалі», «Валдаі» і «Садко», «Белава» і «Фермер» паспяхова канкуруюць з прадукцыяй замежных вытворцаў дзякуючы сваёй цягавітасці, рамонтаздольнасці і параўнальна невысокай цане. «Звязда» даўно і аднaзначна заявіла аб поўнай падтрымцы айчыннага таваравытворцы, і гэтай пазіцыі не мяняе.**

**Міхаіл Андрэевіч Супруновіч кіруе прадстаўніцтвам ГАЗа (дакладней сказаць — дзелавым партнёрам ГАЗа) з самага пачатку яго з'яўлення ў Беларусі, а гэта больш за 20 гадоў. Некалі маленькае гандлёвае прадпрыемства вырасла ў дзясяткі разоў, дыверсіфікавала сваю дзейнасць і зараз займаецца не толькі рэалізацыяй аўтамабіляў з Ніжняга Ноўгарада і запасных частак да іх, але і вытворчасцю аўтатэхнікі, тэхнічным абслугоўваннем у гарантыйны і паслягарантыйны перыяд, аказвае цэлы шэраг паслуг сваім кліентам, у тым ліку па цюнінгу.**

**— Шмат добрых навін для чытача, які зацікаўлена сочыць на старонках «Звязды» за лёсам газаўскіх машын у Беларусі, паважаны Міхаіл Андрэевіч. Вы сталі холдынгам, пачалі ўласную зборку сярэднетанажных аўтамабіляў «ГАЗ-3309» з дызельным рухавіком і «ГАЗ-3307» з бензінавым. Нарошчваеце мадэльны рад аўтамабіляў... Можна доўга загінаць пальцы, але хацелася б, каб свае акцэнты расставіў кіраўнік — чалавек, які фактычна стварыў прадпрыемства з нуля. І заслужана носіць званне лепшага прадпрымальніка краіны.**

— Падзей апошнім часам адбылося сапраўды многа. Пачнем з параўнальна нядаўніх, дастаткова паказальных у сэнсе нашых перспектыў. У рамках савета дзелавога супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь і Ніжагародскай вобласці прайшла цікавая і шматабяцальная для нашага бізнесу сустрэча. Прадпрыемства наведалі губернатар Ніжагародскай вобласці Валерый Паўлінавіч Шанцаў, старшыня заканадаўчага сходу і сенатар ад вобласці. Спадзяёмся, што такія кантакты будуць садзейнічаць павелічэнню тавараабароту і ўмацаванню партнёрскіх адносін паміж Ніжагародскай вобласцю і Беларуссю. Дарэчы, у рамках гэтай сустрэчы мы правялі ў Мінску і прэзентацыю новай газаўскай машыны «Газель NEXT», якая сёння істотна адрозніваецца якаснымі, ды і іншымі параметрамі.

А зараз крыху статыстыкі. Летась мы рэалізавалі ў Беларусі больш за 2500 аўтамабіляў з сімволікай ГАЗа. І тым самым павялічылі продаж больш чым у два разы ў параўнанні з 2011 годам.

**— Удакладніце, калі ласка, якія самыя хадавыя мадэлі?**

— Самая хадавая «Газель Бізнес». Усяго за першы квартал мы прадалі 200 аўтамабіляў «Газель».

На гэты год запланавана яшчэ больш прывабная лічба — пастараемся рэалізаваць да трох з паловай тысяч адзінак газаўскай тэхнікі. Гэта значыць, адбудзецца павелічэнне продажу яшчэ на 1000 аўтамабіляў. Задача сур'ёзная, над ёю і працаваць трэба ўсур'ёз. Чакаем, што справіцца з ёю нам дапаможа вывад на рынак «Газелі NEXT». Варта сказаць пра яе некалькі слоў. Пачнем з таго, што яна атрымала незалежную пярэднюю падвеску і рулявую сістэму з рэечным механізмам, а таксама новую тармазную сістэму. Аўтамабіль спраектаваны з улікам магчымасці ўстаноўкі сродкаў пасіўнай бяспекі — надзіманых падушак і рамянёў з папярэднімі нацягвальнікамі. Там высокі ўзровень не толькі надзейнасці і бяспекі, але і камфорту, сучасны дызайн, надзвычай зручнае рабочае месца вадзіцеля. Крэсла — з пашыраным дыяпазонам рэгуліровак. Адчувальна зніжаны вібрацыі і павышана гукаізаляцыя кабіны.

Гэты новы камерцыйны аўтамабіль — ужо зусім іншы ўзровень расійскага аўтамабілебудавання, яго можна смела параўноўваць з аналагічнымі мадэлямі заходніх вытворцаў. Я думаю, што ён паўторыць поспех мадэлі бізнес-класа, стане лакаматывам нашага гандлю і дапаможа ўзняць узровень продажу. Яшчэ і таму, што міжсэрвісны інтэрвал павялічаны да 20 тысяч км, а гарантыйны тэрмін — 3 гады альбо 150 тыс. км.

Збіраць у сябе гэтую машыну мы не думаем, асабліва сэнсу ў тым няма. Хутчэй за ўсё, будзем выкарыстоўваць як базу для вытворчасці машын хуткай дапамогі, для ўстаноўкі сваіх аўтафургонаў.

Павялічыць продаж павінна дапамагчы таксама і тое, што мы значна пашырылі мадэльны рад спецаўтатэхнікі ўласнай вытворчасці. Паказалі «ва ўсёй красе» як «Газелі», так і «Валдаі» — збіраем на іх базе сярэдні грузавік, аўтакрамы, машыны для перавозкі хлеба, ізатэрмічныя аўтамабілі, аснашчаныя халадзільным абсталяваннем і без яго і г.д.

Самі сабралі ўжо больш за 200 сярэдніх камерцыйных аўтамабіляў. Важна, што 200-ы аўтамабіль, які выпусцілі на шасі «Валдая», укамплектаваны рухавіком класа «Еўра-4» Мінскага маторнага завода. Такі аўтамабіль на ГАЗе не выпускаецца, і ў перспектыве магчымы пастаўкі ў Расію і краіны СНД. А гэта — новыя гарызонты для нас.

Створаны холдынг. У яго склад уключаны (ці знаходзяцца на стадыі ўключэння) 16 прадпрыемстваў. Адкрылі свае прадпрыемствы ў Магілёве і Баранавічах. Далучылі да сябе «Аўтатаксасэрвіс» і правялі рэструктурызацыю гэтага прадпрыемства, на яго базе арганізаваны дылерскі цэнтр «Сталічны» на праспекце Жукава, 44. Там мы стварылі прадпрыемства, якое аказвае транспартныя паслугі — «Аўтатаксасэрвістранс». Такія паслугі аказваюцца і ўнутры холдынга, але асноўная іх маса (70 працэнтаў) прыпадае на старонніх арганізацыі і фізічных асоб. Прычым у асноўным — на нашых камерцыйных аўтамабілях. Зыходзім з таго, што, каб добра ведаць, што такое аўтамабілі ГАЗ, іх недастаткова прадаваць і абслугоўваць, іх трэба яшчэ і самім эксплуатаваць. Тады мы лепш ведаем «знутры», якія праблемы могуць з'явіцца ў нашых аўтамабіляў падчас эксплуатацыі. З такім прыцэлам эксплуатуем на прадпрыемстве 40 аўтамабіляў ГАЗ і дасканальна ведаем пра іх усё. Значыць, разумеем, што канкрэтна патрэбна, каб кліент быў задаволены нашай работай і нашай тэхнікай.

На базе «Аўтатаксасэрвістранса» захавалі службу таксі «181» — як дыспетчарскую, і робім усё для таго, каб паставіць прадпрыемства на ногі. Сэрвіснае і транспартнае прадпрыемствы працуюць прыбыткова. У дыспетчарскай таксі таксама ёсць перадумовы для рэнтабельнага функцыянавання. Што датычыць перавозак, то для гэтых патрэб маем 50 аўтамабіляў. Займаемся абнаўленнем парка, за год купляем прыкладна дзясятак новых аўто.

На тэрыторыі «Аўтатаксасэрвістранса» на праспекце Жукава, 44 распачынаем вялікае будаўніцтва. Там будзе ўзведзены новы дылерскі цэнтр ГАЗа з аўтасалонам і новым сэрвісам, з офіснымі плошчамі для ўласных патрэб. З'явіцца бізнес-цэнтр плошчай прыкладна 15 тысяч квадратных метраў з такой жа па памеры стаянкай для аўтамабіляў. Гэта — аб'екты першай чаргі, якія павінны быць здадзены ў эксплуатацыю ўжо ў наступным годзе. Будынак офіса стане працягам бізнес-цэнтра, плюс гасцініца бізнес-класа з вялікай колькасцю стаянкавых месцаў.

У нас у стадыі падпісання інвестыцыйны дагавор з Мінгарвыканкамам па будаўніцтве магутнасцяў пад уласную вытворчасць. Бо калі летась выпрабілі каля 260 аўтафургонаў, то на гэты год план — 350, і належным чынам абсталяваныя вытворчыя памяшканні патрэбны як паветра. Акрамя аўтафургонаў, распрацавалі аўтамабілі для медыцыны — машыну хуткай дапамогі, санітарны аўтамабіль, а зараз распрацоўваем рэанімацыйны аўтамабіль на шасі «Газелі». А таксама ўсюдыход, які вы не маглі не заўважыць, калі ішлі да нас, — ён пакуль паркуецца пры ўваходзе ў адміністрацыйны корпус. На ім стаіць марка МАС — Мінская аўтамабільная зборка, яна запатэнтавана. Праўда, некаторыя калегі жартуюць і расшыфроўваюць як першыя літары майго прозвішча, імя і імя па бацьку — Міхаіл Андрэевіч Супруновіч.

Усе гэтыя навінкі трэба ставіць на вытворчасць. Мы паказвалі іх і расійскім прадстаўнікам, і замежным: машыны ім спадабаліся. Той жа ўсюдыход зацікавіў іх як сродак для абсалютнага бездарожжа. Ён плавае (аб'ём шын дазваляе трымацца на плыву), ходзіць спакойна па снезе, па балоце. Цудоўна ходзіць па пясках, дзюнах і барханах. Незаменны як сродак выратавання — можа зайсці ў вялікую палонку і выйсці з яе, узняцца на бераг, сысці з карабля. Грузу бярэ паўтары тоны, але на вадзе можна ставіць паплаўкі і такім чынам нарошчваць грузапад'ёмнасць.

Нашы ўсюдыходы могуць выкарыстоўвацца як пошукавы аўтамабіль для касманаўтыкі, а таксама для геолагаў, ваенных, выратавальнікаў, станцый хуткай дапамогі, падраздзяленняў МУС і іншых аператыўных службаў. І ў сельскай гаспадарцы, дзе машыны на гусенічным ходу не заўсёды і пусціш на палі, бо робяць вельмі шырокую каляіну і шкодзяць палеткам. Наш ідзе паверсе. Можна прымяняць і для ранняга ўнясення ўгнаенняў па пасевах, а пазней — для іх апрацоўкі.

Гэта цалкам наша распрацоўка, мы зараз яе патэнтуем. Ідэя належыць вядомаму айчыннаму падарожніку, кіраўніку Беларускага фонду падтрымкі экстрэмальных экспедыцый «Полюс», літаратару Уладзіміру Нікандравічу Драбу. Ён працуе ў нас начальнікам упраўлення канструктарскіх эксперыментальных распрацовак. Вось яго здымак — ён трымае ў руках сцяг Рэрыха з подпісамі касманаўтаў. Чаму касманаўтаў? Сцяг пабываў у космасе, потым на Паўднёвым полюсе і ў іншых цяжкадаступных месцах планеты. Усяго існуе тры арыгінальныя экземпляры сцяга: адзін знаходзіцца ў Генеральнага сакратара ААН, другі ў музеі Рэрыха ў Маскве і адзін вось тут, у маім кабінеце. На ім вы бачыце подпісы Лявонава, Цітова, Кубасава і іншых пакарыцеляў космасу. Ад пакарыцеляў космасу — пакарыцелям Антарктыкі.

Такім чынам, праабраз нашага ўсюдыхода пабываў на полюсе. Мы ўжо ўніфікавалі і зрабілі значна больш танным. Плануецца, што выпускацца будзе ў дзвюх мадыфікацыях — МАС-4410 «Дняпро» з самай простай камплектацыяй і больш «навароченых» МАС-6615 «Дзвіна» з колавай формулай 6х6. Машына ўдалая, так што патрэбна ставіць на паток. Будзем будаваць тут, у Калядзічах, яшчэ адну вытворчую базу — праектаваць сёлета, а будаўніцтва пачынаць у наступным годзе. Для размяшчэння ўсіх тых вытворчасцяў, пра якія я казаў, таксама.

**— Скажыце, Міхаіл Андрэевіч, ці лёгка далася вам зборка расійскіх грузавікоў? Адна справа — гандаль тэхнікай вядомага брэнда, і зусім іншая — зборачны канвеер са сваёй вытворчай спецыфікай, сваім рытмам, сваімі кадрамі.**

— Гэта абсалютна новая і, спадзяюся, выдатная старонка ў нашай гісторыі. Можна сказаць, што даволі працаёмкі час вялася настойлівая штодзённая работа ў гэтым кірунку. Магчыма, крыху больш напружаная, чым звычайна. Але, як вы разумееце, спатрэбіліся не проста кадры граматныя спецыялісты, спатрэбіліся энтузіясты. Як у любой новай справе. І такія энтузіясты знайшліся, павялі за сабой іншых. Пакуль зборачны ўчастак, на якім адбываецца пастаноўка мінскага дызеля на шасі Горкаўскага аўтазавода, невялікі. Але важна было пачаць, адчуць перспектыву выкарыстання беларускіх рухавікоў для вытворчасці сярэдніх грузавікоў. І зараз мы можам думаць аб нарошчванні магутнасцяў, пра што я вам і расказваў.

Для вытворчасці атрымліваем 180 відаў камплектуючых, у тым ліку закупляем і ў Беларусі. Узровень лакалізацыі шасі 30—40 працэнтаў, у залежнасці ад мадэлі. А калі ўстанаўліваецца нейкае навяснае абсталяванне — вышкі, ёмістасці пад малакавозы і бензавозы, розныя фургоны, што выпускаюцца ў Беларусі з нашым удзелам, то ўзровень лакалізацыі павышаецца да 60 працэнтаў. І фактычна гэта ўжо аўтамабіль беларускай вытворчасці. Для прыкладу вернемся да распрацоўкі Мінскага маторнага завода — іх рухавік класа «Еўра-4», пастаўлены на «Валдай», працуе цудоўна, атрымаўся нармальны аўтамабіль.

**— Вы гаворыце пра даволі высокі працэнт беларускай камплектацыі. Хто з вашых дзелавых партнёраў заслугоўвае, каб пра яго сказалі добрае слова?**

— Словы шчырай удзячнасці на адрас дзелавых партнёраў не грэх паўтарыць. Перш за ўсё гэта той жа Мінскі маторны завод. Яны, як я ўжо расказваў, зрабілі рухавік класа «Еўра-4», а зараз завяршаюць распрацоўку газадызельнага матора. Калі атрымаецца ўдалым, то аснашчаная ім машына таксама будзе запатрабавана на рынках, і не толькі ў Беларусі. Выношваем планы пастаўкі ў Расію, Казахстан і іншыя краіны СНД.

З намі даўно супрацоўнічае Гродзенскі завод карданных валоў, пастаўляе амартызатары і карданы. Яны пайшлі нам насустрач па цэнах, наогул па пастаўках, што важна. «Белшына» пастаўляе нам пакрышкі не непасрэдна з завода, а з ГАЗа, ужо ў зборцы з планерамі (шасі з кабінай), так больш зручна. Своечасова і якасна яна выпусціла спецыяльную партыю для ўсюдыходаў, мы разам зрабілі аснастку для вытворчасці шын звышнізкага ціску. Наогул, у нас даўнія добрыя партнёрскія адносіны.




У нядаўніх урачыстасцях з нагоды выпуску 200-га аўтамабіля ўласнай зборкі ўзялі ўдзел губернатар Ніжагародскай вобласці Валерый ШАНЦАЎ (справа) і дырэктар па рэалізацыі і маркетынгу ААТ «Камерцыйныя аўтамабілі — Група ГАЗ» Алег МАРКАЎ.

**— Але вернемся да асноўнай пакуль што вашай дзейнасці. Якім чынам удалося выйсці на ранейшыя паказчыкі рэалізацыі аўтамабіляў у Беларусі?**

— Аднаўленне аб'ёмаў продажу адбылося перш за ўсё за кошт таго, што эканоміка Беларусі працуе, аўтамабілі бізнес-класа запатрабаваны ў дзяржаўных структурах, на дзяржаўных прадпрыемствах і ва ўстановах, у абаронным сектары, сістэме МУС і камунальнай уласнасці. Яны выкарыстоўваюцца ў многіх галінах, і ў прыватным бізнесе таксама.

І нельга адмаўляць той факт, што прафесіянальны ўзровень нашых спецыялістаў, якія займаюцца продажам аўтатэхнікі, за апошні час стаў значна вышэйшым. Калі раней мы ў асноўным проста афармлялі продаж таму, хто звяртаўся да нас сам, то сёння займаемся актыўным продажам: ідзём да пакупніка, да кліента і прапануем яму не проста аўтамабіль, а комплекс паслуг па пакупцы аўтамабіля. Пры гэтым падбіраем сапраўды выгадны для яго варыянт. Напрыклад, калі бізнесмен-пачатковец купляе «Газель», то яна акупіцца за год, а затым на працягу яшчэ некалькіх гадоў пры любой нагрузцы аўтамабіль будзе прыносіць прыбытак, зарабляць грошы, у тым ліку і на наступную машыну. Так што за год «Газель» сама сябе акупляе.

Акрамя таго, прапануем і іншыя праграмы, якія заслугоўваюць увагі. Скажам, праграма ўтылізацыі. Згодна з ёю можна здаць аўтамабіль, які сваё ад'ездзіў, і атрымаць зніжку ў 18 мільёнаў пры набыцці новага аўтамабіля. Аўтамабілі прымаем любыя — легкавыя, грузавыя, любой маркі і розных вытворцаў, а прадаём толькі свае. Зніжка перавышае дзве тысячы долараў і з'яўляецца сур'ёзным аргументам. Летась наогул давалі зніжку тры тысячы долараў — і па праграме ўтылізацыі аформілі трыста аўтамабіляў. На гэты год планы такія ж. Праграма гэтага года пачала дзейнічаць з 1 красавіка, і мы запрашаем да сябе тых, хто прывык разумна эканоміць. Выгадная праграма, гэта відавочна.

Калі ўсур'ёз клапаціцца пра заўтрашняга пакупніка, то трэба думаць пра... дзяцей. Газаўская тэхніка павінна быць побач з імі з самага маленства. Таму праграма ўтылізацыі мае і як бы падпраграму — «Дзіцячы аўтамабіль». Запланавалі правесці 1 чэрвеня, у Дзень абароны дзяцей, свята, на якім, акрамя ўсяго іншага, нашы маленькія госці ўзамен зламаных цацачных аўтамабіляў атрымаюць новыя цацкі — маленькую «Газель» ці маленькага «Собаля». З цягам часу дзеці падрастаюць, і важна, каб побач былі спачатку цацкі з лагатыпам Горкаўскага завода, а потым, глядзіш, і сапраўдныя аўто. Бо дзеці ўплываюць на бацькоў. За тыя 20 гадоў, што мы на рынку, вырасла цэлае пакаленне, якое пачало ездзіць на нашых машынах.

**— Асобная тэма — запасныя часткі...**

— Вось цікавая лічба. Продаж запасных частак у 2012 годзе ў параўнанні з 2011-м падвоіўся. На гэты год таксама плануем далейшы прырост іх рэалізацыі, праз уласную сетку таксама. І оптавы продаж, і рознічны. Не таму, што наша тэхніка пачала часцей ламацца, проста яе самой стала значна больш у рэгіёне, які мы абслугоўваем.

У нас у Мінску вялікі цэнтральны рэзервовы склад запасных частак, куды вядзецца прамая пастаўка арыгінальных запасных частак з Горкаўскага аўтамабільнага завода. Гэта дае гарантыю іх якаснай работы. Для ўладальніка камерцыйнага аўтамабіля на першым плане нават не цана запчасткі, а тое, як хутка яна будзе дастаўлена спажыўцу, і машына паедзе. Камерцыйнаму аўтамабілю часцей за ўсё замены няма. Калі «завіс» ваш асабісты легкавік, вы можаце перасесці на машыну жонкі, выклікаць таксі альбо паехаць на тралейбусе ці метро. А камерцыйны аўтамабіль павінен працаваць і прыносіць прыбытак, а не стаяць. Можна наняць іншы, але гэта лішнія затраты. Таму мае значэнне, наколькі хутка мы абслужылі свайго кліента. У нас усё пастаўлена так, каб абслужыць максімальна хутка. Наша сэрвісная сетка максімальна набліжана да кліента, па ўсёй Беларусі няма пункта, аддаленага больш чым на сто кіламетраў ад сэрвісу ці магазіна аўтамабіляў і запчастак. Дарэчы, у нас зараз самая разгалінаваная сэрвісна-збытавая сетка ў Беларусі.

Гэтая статыстыка ўжо прыводзілася: за ўвесь час сваёй работы мы прадалі больш за 20 тысяч аўтамабіляў маркі ГАЗ. Гэта — наша лічба, «БелгГАЗаўтасэрвіса». Але машынамі з Горкага, затым з Ніжняга Ноўгарада гандлявалі і іншыя арганізацыі, так што газаўскай тэхнікі ў Беларусі толькі за 20 апошніх гадоў прададзена недзе каля 70 тысяч адзінак. Значыць, трэба дапамагаць іх даглядаць. Таму клапоцімся аб арганізацыі належнага сэрвісу. Тым больш што сёння мы — дыстрыб'ютары ГАЗа па пастаўках аўтамабіляў у Рэспубліку Беларусь, маем эксклюзіўныя правы і трымаем, што называецца, руку на пульсе працэсу.

**— Зліццё з «Аўтатаксасэрвісам» дазволіла вам пашырыць сэрвісную базу?**

— Безумоўна. Мы пашырылі сэрвісныя паслугі для горада Мінска і бліжэйшых раёнаў. На той пляцоўцы разоў у пяць пашырыўся аб'ём паслуг, якія аказваюцца прадпрыемствам і фізічным асобам. Геаграфічна база размешчана ў горадзе, на другім кальцы, гэта зручна для кліентаў. Калі мы далучалі іх да сябе, то захавалі вытворчыя магутнасці і калектыў, а людзі там працуюць у асноўным прафесійна граматныя. Некаторыя дасягнулі паважанага ўзросту, але калі чалавек можа і жадае працаваць, то ўзрост не перашкода. Наадварот, такі работнік «бярэ» вопытам, прафесіянальнымі ведамі, кампетэнтнасцю.

**— Крыху пагаворым пра рынкі. Вы ўжо працуеце з уласнай пляцоўкі ў Ніжнім Ноўгарадзе? І ці пастаўляеце прадукцыю ў Расію?**

— Так, там таксама выпускаем аўтамабільныя фургоны. Зараз паступіў заказ з ГАЗа — на яго канвееры будуць выкарыстоўвацца нашы фургоны для «Газелі NEXT».

Што датычыць іншых рынкаў, то вядзём перагаворы з Прыбалтыкай. Магчыма, будзе створана сумеснае прадпрыемства па вытворчасці фургонаў з нашых сэндвіч-панеляў для пастаўкі ў Еўропу. Канкрэтна — на польскі рынак, у Германію, тую ж Прыбалтыку. Лічым, што трэба больш настойліва асвойваць рынкі краін-суседзяў. Нашы фургоны па якасці адпавядаюць еўрапейскім крытэрыям, таму пройдзем сертыфікацыю і пачнём актыўна гандляваць. Схема можа быць такая: мы ажыццяўляем пастаўку камплектных вырабаў, а зборка вядзецца ў Літве ці Польшчы.

**— Лізінг як форма гандлю і ваш рабочы інструмент пашыраецца ўсё больш?**

— Як лізінгавая кампанія мы працуем на рынку прыкладна пяць гадоў. А зараз прыцягваем і іншыя лізінгавыя кампаніі — каб павялічыць фінансавыя рэсурсы для лізінгу і дапамагчы нашаму кліенту. Гэтую праграму будзем нарошчваць. Купляць нашы «Газелі» і сярэднія грузавікі ў лізінг вельмі выгадна. Практычна за адзін год аўтамабіль сябе апраўдвае, адпрацоўвае затрачаныя на яго грошы і далей зарабляе прыбытак. Можна пачынаць бізнес з нуля, напрыклад, па перавозцы прадуктаў. Маюць права на такую пакупку па лізінгу не толькі фірмы, юрыдычныя асобы, але і ІП — прыватныя прадпрымальнікі. А фізічныя асобы набываюць аўтамабіль у крэдыт, што таксама зручна.

**— Мы гаварылі, што ў вашых планах — далейшае пашырэнне дылерскай сеткі...**

— Дадаткова адкрылі сваё прадстаўніцтва ў Баранавічах. У Брэсце яно ўжо працуе, там цяпер дастаткова вялікая база. Нам належыць 50 працэнтаў акцый гэтага прадпрыемства. Зараз яны пачынаюць будаўніцтва аўтасалона і новага офіса. Плануем адкрыць там сэрвісую зону на некалькі рабочых месцаў. Так што спыняцца на дасягнутым не збіраемся, няхай канкурэнты на гэта не спадзяюцца. Як кажуць у народзе, «не дачакаецеся»!




«Газель NEXT» з фургонам «БЕЛАВА» ніжагародскі губернатар перадаў мінскаму дзіцячаму дому № 7 «Сем Я».




Аўтамабіль хуткай медыцынскай дапамогі, па ацэнках медыкаў, зручны і надзейны.

Вось яна, прыгажуня «Газель NEXT».






На шасці колах гэты аўтамабіль праедзе па любым бездарожжы.

Публікацыю падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ і Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

УНП 191432786